ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ, КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР, МІНІСТЭРСТВА КІНЕМАТАГРАФІІ БССР І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ УСТАНОЎ ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР.

№ 44 (798) | Субота, 28 кастрычніка 1950 года | Цана 50 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Першая старонка.

За ўзорнае кіноабслугоўванне сельскага насельніцтва (перадавы артыкул).

І. Саладкоў. — М. В. Фрунзе на Беларусі.

А. Палеес.—Неўміручы вобраз большэвіка.

Другая старонка.

Забяспечыць паказ кінокарцін ва ўсіх населеных пунктах рэспублікі.

Пятрусь Броўка. — Стася (верш).

Трэцяя старонка

Р. Сабаленка. — Песня жыццю.

Ганна Аляхновіч. — Новыя вершы.

Ів. Кудраўцаў. — Страты і прыбыткі.

ЛІСТЫ Ў РЭДАКЦЫЮ: **В. Калтуноў.** — З чаго ліха... **І. Літвіненка.** — Забыты абавязак.

Чацвертая старонка.

Песнятворцы. (З нарады самадзейных кампазітараў).

А. Семяновіч. — Неапублікаваныя творы Якуба Коласа.

За ўзорнае кіноабслугоўванне сельскага насельніцтва

Нястомнымі клопатамі большэвіцкай партыі і Совецкага ўрада аб культурным росце працоўных створаны ўсе ўмовы для самага шырокага абслугоўвання народных мас паказам кінокарцін.

У два з паловай разы вырасла кіносетка рэспублікі ў параўнанні з даваенным 1941 годам. Па БССР на 1951 год запланавана яшчэ 415 кіноўстановак. Ужо сёння адна кіноўстаноўка прыпадае на два сельсоветы, а фільмафонд рэспублікі мае больш пяці тысяч копій кінокарцін. Усё гэта дае кіноарганізацыям рэспублікі невычарпальныя магчымасці для самага шырокага паказу совецкіх кінокарцін у горадзе і на вёсцы.

Аднак, як устаноўлена Цэнтральным Камітэтам КП(б) Беларусі, гэтыя велізарныя магчымасці вельмі дрэнна выкарыстоўваліся ў практычнай рабоце органаў кінафікацыі і пракату рэспублікі.

Асабліва нездавальняюча пастаўлена гэтая работа на вёсцы. У сваёй пастанове аб забеспячэнні паказу кінокарцін ва ўсіх населеных пунктах рэспублікі ЦК КП(б)Б падкрэсліў, што «кіноабслугоўванне сельскага насельніцтва праводзіцца ў адрыве ад палітычных і гаспадарчых задач, якія вырашаюць партыйныя і совецкія органы». Рэспубліканская нарада, якая была нядаўна склікана ЦК КП(б)Б для абмеркавання пытання аб стане і мерах па палепшанню кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва, поўнасцю пацвердзіла глыбокі аналіз работы кіноарганізацыі рэспублікі, дадзены ў пастанове Цэнтральнага Камітэта партыі. Гэтая работа, як адзначыў у сваім дакладзе сакратар ЦК КП(б)Б тав. Ц. С. Гарбуноў, праводзілася фармальна, без вывучэння і выхавання сваіх кадраў, без абагульнення і вывучэння іх вопыту.

Міністэрства кінематаграфіі БССР і яго органы ў абласцях і раёнах дрэнна разумелі сваю адказную і вялікую ролю ў справе ідэйнага выхавання совецкага народа.

«Кіно ў руках совецкай улады, — пісаў таварыш Сталін, — уяўляе велізарную, неацанімую сілу. Валодаючы выключнымі магчымасцямі духоўнага ўздзеяння на масы, кіно дапамагае рабочаму класу і яго партыі выхоўваць працоўных у духу социялізма, арганізаваць масы на барацьбу за социялізм, узмацніць іх культуру і палітычную боездольнасць». Гэтае гістарычнае сталінскае палажэнне зрабілася непарушным законам жыцця і працы работнікаў совецкай кінематаграфіі. Але асобныя работнікі Міністэрства кінематаграфіі БССР не пранікліся глыбока сталінскімі ўказаннямі і таму страцілі палітычны курс у сваёй рабоце, згубілі асноўнае звяно, ухапіўшыся за якое, можна было выцягнуць увесь ланцуг.

Гэтым звяном у сістэме кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва з'яўляецца кіномяханік. Палітычна развіты, тэхнічна адукаваны кіномяханік вырастае ў вядучую фігуру агітацыі і прапаганды сродкамі кіномастацтва. У нашай рэспубліцы ён, на жаль, не стаў яшчэ такім. Пастанова ЦК КП(б)Б і нарада выявілі, што сельскі кіномяханік быў самым занядбаным у сістэме Міністэрства кінематаграфіі БССР і яго органаў. Работа яго была пушчана на самацёк, яна рэдка кантралявалася і яшчэ менш накіроўвалася. Кіномяханік не меў цвёрдага маршруту і графіка, ён не ведаў раскладу карцін. І не дзіва, што на пасаду кіномяханіка пранікалі часам прайдзісветы і жулікі, якія ператварылі кіноабслугоўванне ў сродак асабістай нажывы.

Лічачы, што адной з важнейшых задач кіноабслугоўвання на сяле з'яўляецца падбор кадраў кіномяханікаў, ЦК КП(б) Беларусі абавязаў кіраўніцтва комсамольскімі арганізацыямі рэспублікі вылучыць пяцьсот комсамольцаў і накіраваць іх у сельскую кіносетку.

ЦК ЛКСМБ выканаў гэтае ўказанне партыі. Міністэрства кінематаграфіі БССР абавязана зараз разумна і ўмела скарыстаць залаты фонд новых кадраў, арганізаваць іх працу так, каб у бліжэйшы час яны змаглі паказаць узоры і прыклады кіноабслугоўвання на высокім палітычным узроўні.

Для арганізацыі справы кіноабслугоўвання Міністэрства павінна скарыстаць і папырыць той станоўчы вопыт, які ўжо набыты. У рэспубліцы ёсць дзесяткі сельскіх кіномяханікаў, якія арганізавалі сваю работу з поўнай адказнасцю перад партыяй і народам. Ёсць цэлыя раёны, дзе справа кіноабслугоўвання з'яўляецца прыкладам большэвіцкіх адносін да працы. Паказальным у гэтых адносінах з'яўляецца вопыт работы Гарадоцкага раённага аддзела кінафікацыі на Віцебшчыне. Абапіраючыся на дапамогу партыйных, комсамольскіх і совецкіх арганізацый раёна, работнікі кінафікацыі перабудавалі сваю работу так, што насельніцтва раёна прагледзела ўсе лепшыя совецкія карціны.

Выкарыстоўваючы раённы друк, радыё і іншыя сродкі рэкламы совецкіх карцін, работнікі кінафікацыі і пракату дабіваюцца шырокага ахопу гледачоў, і таму яны сістэматычна, з месяца ў месяц перавыконваюць свае планы. А такія кіномяханікі, як т. т. Іванькоў і Тураўскі выканалі свае гадавыя планы яшчэ ў верасні і працуюць цяпер у лік 1951 года.

На нарадзе выступіў кіномяханік-стахановец тав. Пікала (Асіповіцкі раён), які расказаў аб вопыце сваёй работы. Вопыт таксама вельмі павучальны. На сеансах тав. Пікалы заўсёды поўна народу, бо калгаснікі загадзя ведаюць, калі да іх прыязджае кіноперасоўка, які фільм будзе паказаны і нават які змест гэтага фільма, што, між іншым, вельмі важна ў рабоце сельскага кіномяханіка. Але не кожны кіномяханік можа давесці да гледача змест карціны, бо не мае на руках адпаведнага растлумачальнага матэрыялу, які павінен забяспечвацца Беларускай канторай Галоўкінопракату. Тав. Пікала зусім слушна папракнуў работнікаў пракату, што яны яшчэ неахайна ставяцца да папулярызацыі сярод калгаснага гледача карцін шляхам масавага выпуску тэкстовак са зместам фільмаў, з водгукамі прэсы і г. д. Недапушчальным з'яўляецца і тое становішча ў рабоце органаў пракату, калі на калгасныя экраны зусім слаба прасоўваюцца навукова-папулярныя, дакумэнтальныя і хранікальныя фільмы, якія чамусьці больш ляжаць на складах, чым дэманструюцца на экранах.

Трэба лічыць злачынствам, калі на экраны выпускаюцца тэхнічна непрыгодныя фільмы, у часе дэманстрацыі якіх нельга разабраць ні слоў, ні музыкі. А такія выпадкі былі і ёсць — і яны кампраметуюць не толькі творы совецкай кінематаграфіі, а і само кіноабслугоўванне.

Лепшыя, перадавыя работнікі кінафікацыі і пракату, якіх у рэспубліцы многа, на практыцы паказалі, як можна перабудаваць работу кіноабслугоўвання. Улічваючы гэты вопыт, першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. Н. С. Патолічаў у сваім выступленні на нарадзе вызначыў асноўны кірунак перабудовы работы беларускіх кіноарганізацый.

«ЦК КП(б)Б прапануе, — сказаў Н. С. Патолічаў, — устанавіць для кожнай кіноперасоўкі зусім строгі, чоткі маршрут, каб было вядома, якога чысла і ў якім калгасе дэманструецца кінокарціна. Больш таго, мы лічым зусім неабходным, каб гэтаму калгасу і кіномяханіку прынамсі за два тыдні паведамлялі, якая карціна будзе дэманстравацца, каб аб ёй загадзя было паведамлена і можна было-б рэкамендаваць адпаведную літаратуру, а работнікі, якія дапамагаюць кіномяханікам, маглі-б адпаведна падрыхтавацца. Можна і трэба зрабіць, каб кіномяханікі і гледачы былі падрыхтаваны да прагляду карціны».

Гэтае ўказанне павінна легчы ў аснову кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва, а яго выкананню Міністэрства кінематаграфіі БССР і яго органы на месцах павінны надаць большэвіцкі размах, каб паспяхова садзейнічаць справе комуністычнага выхавання, справе ўздыму народнай гаспадаркі і культуры Беларусі.

Дзеячы літаратуры і мастацтва — члены выбарчых камісій

Пісьменнікі і дзеячы мастацтва прымаюць актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы. Яны працуюць у якасці агітатараў і членаў выбарчых камісій.

Так, Пятро Глебка з'яўляецца членам выбарчай камісіі па выбарах у Мінскі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных.

У склад раённай выбарчай камісіі па выбарах у Сталінскі раённы совет дэпутатаў працоўных г. Мінска ўваходзяць — пісьменнік Міхась Лынькоў і заслужаная артыстка рэспублікі С. Станюта. Народная артыстка БССР А. Нікалаева—член раённай выбарчай камісіі па выбарах у Варашылаўскі раённы Совет дэпутатаў працоўных г. Мінска.

Народны артыст рэспублікі А. Ільінскі—член камісіі па выбарах у Віцебскі абласны Совет дэпутатаў працоўных.

Творчыя работнікі з'яўляюцца таксама членамі акруговых выбарчых камісій.

М. В. Фрунзе на Беларусі

(Да 25-годдзя з дня смерці М. В. Фрунзе)

Чвэрць стагоддзя таму назад, 31 кастрычніка 1925 года, памёр верны вучань і таленавіты саратнік Леніна і Сталіна, выдатны дзеяч большэвіцкай партыі і Совецкай дзяржавы, бясстрашны рэволюцыянер, выдатны пролетарскі палкаводзец і ваенны тэарэтык — Міхаіл Васільевіч Фрунзе.

Смерць М. В. Фрунзе з'явілася цяжкай стратай для большэвіцкай партыі і ўсяго совецкага народа. «У асобе таварыша Фрунзе, — гаварыў таварыш Сталін, — мы страцілі аднаго з самых чыстых, самых чэсных і самых бясстрашных рэволюцыянераў нашага часу.

Партыя страціла ў асобе таварыша Фрунзе аднаго з самых верных і самых дысцыплінаваных сваіх кіраўнікоў.

Совецкая ўлада страціла ў асобе таварыша Фрунзе аднаго з самых смелых і самых разумных будаўнікоў нашай партыі і нашай дзяржавы.

Армія страціла ў асобе таварыша Фрунзе аднаго з самых любімых і паважаных кіраўнікоў і стваральнікаў» (І. Сталін, Творы, т. 7, стар. 250).

Усё сваё слаўнае гераічнае жыццё М. В. Фрунзе прысвяціў вялікай справе вызвалення працоўных, барацьбе за перамогу комунізма. Ужо з юнацкіх год, уключыўшыся ў актыўную рэволюцыйную дзейнасць у цяжкіх умовах царскага падполля, М. В. Фрунзе адразу вызначыўся як прафесійны рэволюцыянер, як найвыдатнейшы арганізатар і кіраўнік ленінска-сталінскага тыпу.

Уступіўшы ў лістападзе 1904 года ў рады партыі большэвікоў, М. В. Фрунзе ўжо тады паказаў сябе палымяным большэвіцкім прапагандыстам, агітатарам і выдатным арганізатарам. У 1905—1907 г. г. ён быў арганізатарам Іванава-Вазнясенскай акруговай партарганізацыі, пасля — Іванава-Вазнясенскага Саюза РСДРП, які кіраваў рэволюцыйнай барацьбой рабочых ва ўсім Іванава-Вазнясенскім прамысловым раёне, уключаючы такія гарады, як Іванава-Вазнясенск, Шуя, Кінешма, Юр'евец і іншыя.

У 1905 годзе М. В. Фрунзе кіраваў вялікай забастоўкай тэкстыльшчыкаў, якая ахапіла ўвесь прамысловы Іванава-Вазнясенскі раён, а таксама стварыў баявыя рабочыя дружыны, абучаў рабочых майстэрству ўзброенага паўстання супроць царызма. Будучы дэлегатам на IV (Аб'яднаўчым) з'ездзе РСДРП у Стакгольме, М. В. Фрунзе ўпершыню сустрэўся з Леніным і Сталіным.

У перыяд з 1904 г. да пачатку 1907 г. М. В. Фрунзе неаднаразова арыштоўваўся, двойчы быў прыгавораны царскім судом да пакарання смерцю за ўзброеную барацьбу супроць самаўладства. Пад напорам рашучых пратэстаў рабочых суд вымушаны быў замяніць смяротнае пакаранне дзесяцігадовай катаргай.

Калі пачалася першая сусветная імперыялістычная вайна, Фрунзе знаходзіўся ў высылцы, аднак у жніўні 1915 года яму ўдалося ўцячы з турмы, і ён стаў прапаваць нелягальна ў Забайкальскай вобласці пад прозвішчам Владзіміра Грыгор'евіча Васіленкі.

У красавіку 1916 года М. В. Фрунзе прыбыў у Мінск і пад прозвішчам Міхаіла Аляксандравіча Міхайлава паступіў на службу ў камітэт Заходняга фронта Усерасійскага земскага саюза. Служба ў гэтым камітэце давала магчымасць М. В. Фрунзе раз'язджаць без перашкод па раёнах Беларусі, дзе была размешчана вялікая колькасць войск.

Знаходзячыся на службе ў камітэце Заходняга фронта, М. В. Фрунзе ўстанавіў шчыльную сувязь з большэвікамі-падпольшчыкамі, якія працавалі на тэрыторыі Беларусі і ў воінскіх часцях, стварыў рад новых партыйных арганізацый у ваенных майстэрнях у г. Мінску, а таксама ў Трэцяй і Дзесятай арміях Заходняга фронта.

Гэтыя падпольныя большэвіцкія арганізацыі пад непасрэдным кіраўніцтвам М. В. Фрунзе ўзначальвалі барацьбу працоўных Беларусі і салдат Заходняга фронта супроць царызма, непахісна ажыццяўлялі лінію ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта партыі аб ператварэнні вайны імперыялістычнай у вайну грамадзянскую, аб паражэнні царскага самаўладства ў вайне.

Асабліва кіпучую дзейнасць разгарнуў М. В. Фрунзе на тэрыторыі Беларусі ў перыяд падрыхтоўкі Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі.

Пасля Лютаўскай рэволюцыі большэвікі Беларусі на чале з М. В. Фрунзе, выконваючы ўказанні Леніна і Сталіна, з усёй рашучасцю змагаліся за ўстанаўленне адзінаўладства Советаў, за перарастанне буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі ў рэволюцыю социялістычную, за ўстанаўленне дыктатуры пролетарыята.

Уся асноўная работа большэвіцкіх арганізацый у Беларусі ў перыяд ад лютага да кастрычніка 1917 года праходзіла пад непасрэдным кіраўніцтвам М. В. Фрунзе. Ленінска-сталінскі Цэнтральны Камітэт праз яго ажыццяўляў сваё кіраўніцтва большэвіцкімі арганізацыямі Беларусі і Заходняга фронта па пераходу ад буржуазна-дэмакратычнай рэволюцыі да социялістычнай.

Гаворачы аб сваёй рэволюцыйнай дзейнасці ў Беларусі, М. В. Фрунзе паведамляў наступнае:

«Пад прозвішчам «Міхайлаў» трапіў на Заходні фронт ва Усерасійскі земскі саюз. Працаваў тут пад стварэннем нелягальнай рэволюцыйнай арганізацыі. К моманту Лютаўскай рэволюцыі стаяў на чале падпольнай рэволюцыйнай арганізацыі з цэнтрам у Мінску, якая мела аддзяленні ў 10-ай і 3-яй арміях.

З пачатку Лютаўскай рэволюцыі стаў адным з кіраўнікоў рэволюцыйнага руху ў Мінску, у Беларусі і на Заходнім фронце. Правёў раззбраенне Мінскай паліцыі і жандармерыі і стаў начальнікам Мінскай грамадзянскай міліцыі. Быў арганізатарам Мінскага Совета рабочых дэпутатаў і пастаянным членам Выканаўчага Камітэта. Быў арганізатарам Советаў сялянскіх дэпутатаў у Беларусі, правёў два з'езды беларускага сялянства. Быў старшынёй Совета сялянскіх дэпутатаў у Беларусі першага склікання і старшынёй Выканаўчага камітэта. Быў членам прэзідыума Усерасійскага з'езда сялянскіх дэпутатаў ад беларускай вобласці. Быў адным з арганізатараў з'езда армій Заходняга фронта і ў выніку з'езда быў абраны членам франтавога камітэта армій Заходняга фронта. Быў адным з рэдактараў большэвіцкіх газет, якія выдаваліся ў Мінску («Звязда»). У карнілаўскія дні сумесным паседжаннем франтавога камітэта і Выканаўчага камітэта Мінскага Совета быў прызначаны начальнікам штаба рэволюцыйных войск Мінскага ўчастка».

Будучы старшынёй губернскага сялянскага камітэта, М. В. Фрунзе разгарнуў кіпучую дзейнасць па падрыхтоўцы да сялянскага з'езда. Ён аб'ехаў дзесяткі населеных пунктаў Беларусі, праводзіў сходы сялян, арганізоўваў рэволюцыйныя сялянскія камітэты на месцах, заклікаў сялян-беднякоў узяць зямельную справу ў свае рукі, шчыльней згуртаваць свае рады вакол пролетарыята, ісці па шляху, указанаму большэвіцкай партыяй, мужна змагацца за перамогу социялістычнай рэволюцыі.

Пры актыўнай і арганізуючай ролі М. В. Фрунзе ўжо ў пачатку красавіка 1917 года сталі стварацца валасныя і сельскія сялянскія камітэты, якія ў хуткім часе пакрылі сваёй сеткай амаль усю тэрыторыю Беларусі. Арганізуючы сялянскія камітэты, большэвікі на чале з М. В. Фрунзе каардыніравалі сялянскі рух з баявымі органамі пролетарыята — Советамі рабочых дэпутатаў.

Выконваючы ўказанне Леніна і Сталіна, большэвікі Беларусі на чале з М. В. Фрунзе праводзілі вялікую работу па арганізацыі батракоў, абапіраліся на іх велізарную армію ў сваёй барацьбе супроць контррэволюцыйных сіл на вёсцы.

Выконваючы ленінска-сталінскае ўказанне аб неабходнасці заваявання салдацкіх мас на франтах, якія размешчаны паблізу ад рашаючых палітычных і эканамічных цэнтраў краіны, большэвікі Беларусі пад непасрэдным кіраўніцтвам вернага саратніка Леніна і Сталіна—М. В. Фрунзе праводзілі велізарную прапагандысцкую і арганізацыйную работу ў вайсках Заходняга фронта, пераадольваючы ўсе перашкоды, якія рабілі прадстаўнікі Часовага ўрада, стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага і згодніцкія партыі.

Па ініцыятыве большэвікоў Мінскі Совет склікаў з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў армій Заходняга фронта, які адбываўся з 7 па 16 красавіка 1917 года.

Па патрабаванню большэвікоў-дэлегатаў на чале з М. В. Фрунзе з'езд уключыў у парадак дня пытанні аб вайне і міры, аб Часовым урадзе, аб ваенных рабочых і сялянскіх арганізацыях. Гэта былі тыя пытанні, якія найбольш ажыўлена і актыўна абмяркоўваліся на з'ездзе.

У сваіх выступленнях па ўказаных пытаннях прадстаўнік ЦК РСДРП(б) А. Бадаеў, а таксама і М. В. Фрунзе, які стаяў на чале большэвікоў, выкрывалі імперыялістычны характар вайны, растлумачвалі салдацкім дэпутатам, што скончыць вайну сапраўды дэмакратычным мірам немагчыма без перамогі социялістычнай рэволюцыі, без звяржэння буржуазіі і пераходу ўсёй улады ў рукі Советаў.

Немалаважную ролю адыгралі працоўныя Беларусі пад кіраўніцтвам М. В. Фрунзе ў разгроме карнілаўскага контррэволюцыйнага мецяжу. Па ініцыятыве большэвікоў ва ўсіх гарадах Беларусі і часцях Заходняга фронта былі створаны органы барацьбы з контррэволюцыяй — рэволюцыйныя камітэты, адбывалася ўзбраенне рабочых і стварэнне чырвонагвардзейскіх атрадаў. Каб аказаць істотную дапамогу Петраграду, Маскве і іншым цэнтрам краіны ў разгроме карнілаўшчыны, большэвікі Беларусі паставілі перад сабой і паспяхова ажыццявілі задачу па мабілізацыі ўсіх рабочых і рэволюцыйных салдат на актыўную барацьбу з карнілаўшчынай, на ізаляцыі ад фронта цэнтра контррэволюцыйнай змовы—стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага, якая знаходзілася ў Магілёве, па затрыманню эшалонаў карнілаўскіх войск, не даючы ім магчымасці рухацца на Петраград і Маскву праз такія важнейшыя чыгуначныя вузлы, як Мінск, Гомель, Віцебск і Орша.

Уся шматгранная дзейнасць большэвіцкіх арганізацый Беларусі па мабілізацыі мас на барацьбу з карнілаўшчынай адбывалася пад непасрэдным кіраўніцтвам М. В. Фрунзе. Ужо тады, у перыяд арганізацыі ўзброенага адпору контррэволюцыйнаму выступленню генерала Карнілава, выявіўся выдатны палкаводчы талент вернага саратніка Леніна і Сталіна—Міхаіла Васільевіча Фрунзе. Ён узначаліў штаб рэволюцыйных войск Мінскага ўчастка па барацьбе з карнілаўшчынай, арганізаваў шматлікія чырвонагвардзейскія атрады і арганізаваў іх ваеннае навучанне, устанаўліваў ахову заводаў, фабрык, вакзалаў, электрастанцый, пошты і тэлеграфа, пасылаў большэвіцкіх агітатараў у воінскія часці для выкрывання контррэволюцыйнай сутнасці карнілаўскай змовы.

У выніку велізарнай арганізацыйнай работы, якую правялі большэвікі Беларусі на чале з М. В. Фрунзе па мабілізацыі мас на разгром карнілаўшчыны, была дасягнута амаль поўная блакада стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве — гэтага галоўнага гнязда карнілаўскай змовы.

Гераічная барацьба працоўных мас Беларусі і салдат Заходняга фронта, арганізуемая і натхняемая адным з слаўных атрадаў вялікай партыі Леніна—Сталіна—большэвікамі Беларусі на чале з М. В. Фрунзе, у велізарнай ступені спрыяла разгрому карнілаўшчыны ў асноўных цэнтрах краіны, і перш за ўсё ў Петраградзе і Маскве, дзе вырашаўся лёс рэволюцыі. Працоўныя Беларусі, актыўна ўдзельнічаючы ў барацьбе супроць карнілаўшчыны, унеслі каштоўны ўклад у агульную справу разгрома карнілаўшчыны і тым самым спрыялі набліжэнню перамогі Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі ў нашай краіне.

Вялікую работу праводзіў М. В. Фрунзе па мабілізацыі мас на падрыхтоўку і правядзенне ўзброенага паўстання ў Беларусі. На XXIX сходзе Мінскага Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў 5 верасня 1917 года М. В. Фрунзе ў яркай, палітычна вострай і глыбока змястоўнай прамове рашуча выкрываў здрадніцтва меншавікоў, эсэраў і буржуазных нацыяналістаў, заклікаў масы да рэволюцыйнай пільнасці і актыўнай падрыхтоўкі ўсіх сіл да ўзброенай барацьбы, за звяржэнне панавання буржуазіі, за перамогу социялістычнай рэволюцыі.

Велізарная работа М. В. Фрунзе па мабілізацыі працоўных Беларусі на барацьбу за перамогу социялістычнай рэволюцыі прынесла выдатныя вынікі. Яго вобраз вечна будзе жыць у сэрцах працоўных нашай краіны.

І. САЛАДКОЎ,
кандыдат гістарычных навук.

Неўміручы вобраз большэвіка

Мастакі Беларусі свята захоўваюць памяць аб выдатным рэволюцыйным дзеячу і кіраўніку большэвіцкай арганізацыі Беларусі Міхаілу Васільевічу Фрунзе, якому яны прысвяцілі рад сваіх твораў у скульптуры, жывапісу і графіцы.

Асабліва многа працаваў над вобразам М. В. Фрунзе скульптар А. Глебаў. Першая яго работа, прысвечаная М. В. Фрунзе, з'явілася ў 1933 г. Гэта — бюст Фрунзе, устаноўлены ў Доме ўрада, на лесвіцы, якая вядзе ў Вярхоўны Совет БССР. Бюст не захаваўся да нашага часу. Ён быў знішчаны нямецка-фашысцкімі варварамі ў час акупацыі Мінска.

У 1940—1941 г. г. А. Глебаў працуе над праектам помніка М. В. Фрунзе для ўстаноўкі яго супроць Дома абароны ў Маскве. Фашысцкія захопнікі знішчылі ў Мінску і гэты твор скульптара. У 1942 г. А. Глебаў выліў конную статую М. В. Фрунзе для шпіталя ў Маскве.

Вобраз воіна-большэвіка прадаўжае хваляваць скульптара і цяпер. Ён працуе над бюстам і коннай статуяй М. В. Фрунзе, якія будуць экспанаваны на мастацкай выстаўцы ў канцы гэтага года.

Прабыванне М. В. Фрунзе ў Мінску ў 1917 г. і яго ролі арганізатара совецкай улады ў Беларусі прысвяцілі таксама свае творы скульптар А. Арлоў, жывапісцы З. Мірынгаў, Г. Гардон і іншыя. Іх творы былі экспанаваны на дэкадзе мастацкай выстаўкі БССР у Маскве і на Усебеларускай мастацкай выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары БССР» у Мінску ў 1940 годзе.

Скульптар А. Арлоў стварыў цудоўны скульптурны вобраз стваральніка і кіраўніка большэвіцкай арганізацыі ў Мінску ў 1917 годзе. Скульптар увасобіў у сваім творы выдатны вобраз крыштальна чыстага чалавека, які карыстаўся велізарным аўтарытэтам і павагай сярод працоўных Беларусі.

У сваім вялікім палатне «Салдаты Заходняга фронта ў М. В. Фрунзе» жывапісец З. Мірынгаў ярка падкрэсліў выключную ролю М. В. Фрунзе ў справе мабілізацыі сіл народа супроць контррэволюцыі. Ідэйная вартасць карціны ў тым, што яна ярка адлюстроўвае агульнасць інтарэсаў палкаводца і народа, якія імкнуліся да адной мэты — да поўнага разгрому контррэволюцыі і ўстанаўлення совецкай улады.

Жывапісец Г. Гардон у сваёй карціне «М. В. Фрунзе — арганізатар совецкай улады ў Мінску» паказаў Фрунзе, як арганізатара і кіраўніка Мінскага Совета рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў, арганізатара і кіраўніка Першага франтавога з'езда армій Заходняга фронта, як кіраўніка барацьбы супроць карнілаўцаў у Беларусі.

Гэтая-ж карціна пад назвай «М. В. Фрунзе ў Мінску ў 1917 годзе» экспанавалася на выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары БССР».

Творы беларускіх мастакоў, прысвечаныя М. В. Фрунзе, з вялікай любоўю і адданасцю паказваюць велічны вобраз аднаго з найбольш блізкіх саратнікаў Леніна і Сталіна.

А. ПАЛЕЕС.

Забяспечыць паказ кінокарцін ва ўсіх населеных пунктах рэспублікі

Гэтымі днямі ў Мінску адбылася рэспубліканская нарада, скліканая ЦК КП(б) Беларусі для абмеркавання пытання аб стане і мерах па палепшанню кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва. У рабоце нарады прынялі ўдзел сакратары абкомаў і райкомаў КП(б) Беларусі, загадчыкі аддзелаў прапаганды і агітацыі абкомаў і райкомаў партыі, намеснікі старшынь аблвыканкомаў, начальнікі абласных кіраўніцтваў і раённых аддзелаў кінафікацыі, работнікі кінопраката, перадавыя кіномяханікі, дырэктары сельскіх кінатэатраў, работнікі друку і др.

Нараду адкрыў сакратар ЦК КП(б) Беларусі таварыш **Н. С. Патолічаў.**

За сталом прэзідыума — сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. Н. С. Патолічаў, сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. Ц. С. Гарбуноў, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР тав. В. Г. Кудраеў, міністр кінематаграфіі БССР тав. М. Ф. Садковіч, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б тав. Т. Я. Кісялёў, намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б тав. С. Н. Сцёпін, упраўляючая канторай Галоўкінопраката тав. Н. Х. Каржыцкая, сакратар Брэсцкага абкома КП(б)Б тав. В. К. Луцкін, сакратар Пінскага абкома КП(б)Б тав. А. Т. Міновіч, сакратар ЦК ЛКСМБ тав. В. Н. Позняк, кіномяханік Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці І. Ф. Лупянкоў і др.

Пад бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты ўдзельнікі нарады выбіраюць у склад ганарозага прэзідыума Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з вялікім Сталіным.

З дакладам аб пастанове Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі ад 29 жніўня 1950 года «Аб стане і мерах па палепшанню кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва рэспублікі» выступіў сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. **Ц. С. Гарбуноў.**

* * *

Найвялікшыя соцыяльна-эканамічныя пераўтварэнні прывялі да карэннага змянення ў развіцці эканомікі, у быту і культуры працоўных нашай краіны, — гаворыць тав. Гарбуноў. — У выніку велізарных намаганняў нашай партыі і совецкага народа створаны матэрыяльныя прадпасылкі, неабходныя для паспяховай пабудовы комуністычнага грамадства.

Увасабляючы ў жыццё прадначартанні вялікага правадыра таварыша Сталіна, большэвіцкая партыя і Совецкі ўрад вызначылі перад совецкім народам новую праграму гіганцкага будаўніцтва, роўнага і падобнага якому ніколі не ведала і не магла ведаць уся сусветная гісторыя.

З глыбокай патрыятычнай гордасцю за сваю соцыялістычную Радзіму сустрэў совецкі народ прынятыя Совецкім урадам пастановы аб узвядзенні новых гіганцкіх збудаванняў на Волзе, у Туркменіі, на Украіне.

Далейшы наш рух па шляху да комунізма ў велізарнай ступені залежыць ад комуністычнай свядомасці і актыўнасці ўсіх працоўных. Таму комуністычнае выхаванне працоўных у перыяд пераходу ад соцыялізма да комунізма набывае першаступеннае значэнне, з'яўляецца неад'емнай і важнейшай задачай усіх партыйных і совецкіх арганізацый.

Ва ўмовах барацьбы за комунізм выключна важнае значэнне набываюць усе формы комуністычнага выхавання працоўных. Адным з асноўных такіх важных сродкаў, адным з самых масавых сродкаў комуністычнага выхавання працоўных з'яўляецца наша совецкае кіно.

«Кіно ў руках совецкай улады,—пісаў таварыш Сталін,—прадстаўляе велізарную, неацанімую сілу.

Валодаючы выключнымі магчымасцямі духоўнага ўздзеяння на масы, кіно дапамагае рабочаму класу і яго партыі выхоўваць працоўных у духу соцыялізма, арганізаваць масы на барацьбу за соцыялізм, узнімаць іх культуру і палітычную боездольнасць».

Дзякуючы няспынным клопатам партыі і асабіста таварыша Сталіна аб развіцці совецкага кіномастацтва, аб павышэнні ідэйна-мастацкага ўзроўню совецкіх фільмаў, аб прасоўванні іх у шырокія масы працоўных, совецкае кіно за апошнія гады дабілася выдатных поспехаў.

Клопаты партыі і ўрада аб развіцці кіномастацтва, аб палепшанні кіноабслугоўвання насельніцтва знаходзяць сваё выяўленне не толькі ў стварэнні глыбокаідэйных і высокамастацкіх твораў кіномастацтва, але і ў няспынным росце кіносеткі, у аснашчэнні яе перадавой тэхнікай.

Асаблівую ўвагу наша партыя аддае развіццю кіносеткі на сяле. Гэта можна бачыць па прыкладзе развіцця сельскай кіносеткі Беларускай рэспублікі.

Далей дакладчык падрабязна спыняецца на стане і развіцці кіносеткі рэспублікі.

— За пасляваенны перыяд,—гаворыць тав. Гарбуноў,—сельская кіносетка рэспублікі значна вырасла. Цяпер у рэспубліцы ёсць 1.200 кіноўстановак, або ў 2,5 раза больш да колькасці сельскіх кіноўстановак на 1 студзеня 1941 года. Адна кіноўстаноўка прыпадае на 2 сельсоветы.

Няспынны рост матэрыяльна-тэхнічнай базы совецкай кінематаграфіі стварае ўсе ўмовы для больш поўнага і сістэматычнага кіноабслугоўвання не толькі гарадскога, але і сельскага насельніцтва, жыхароў самых аддаленых населеных пунктаў.

Аднак гэтыя вялікія магчымасці вельмі дрэнна выкарыстоўваюцца ў сельскай мясцовасці Беларусі. Нягледзячы на значнае развіццё кіносеткі на сяле, кіноабслугоўванне сельскага насельніцтва рэспублікі пастаўлена нездавальняюча. Міністэрства кінематаграфіі БССР і значная частка абласных кіраўніцтваў і раённых аддзелаў кінафікацыі фармальна адносяцца да арганізацыі кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва, недаацэньваюць кіно, як адзін з магутных сродкаў палітычнага выхавання працоўных.

Дакладчык прыводзіць рад яркіх прыкладаў, характарызуючых нездавальняючы стан кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва ў некаторых абласцях і раёнах рэспублікі.

Спыняючыся на пастанове ЦК КП(б) Беларусі аб стане і мерах па палепшанню кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва, дакладчык гаворыць аб тым, што ЦК КП(б) Беларусі грунтоўна і ўсебакова вывучыў стан спраў з кіноабслугоўваннем сельскага насельніцтва і ў сваёй пастанове адзначыў, што многія партыйныя арганізацыі выпусцілі з сваіх рук кіно, гэтую магутную ідэалагічную зброю партыі, і справу кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва прадаставілі самацёку.

Кіноперасоўка—важнейшы сродак агітацыі і прапаганды, важнейшы сродак палітычнага ўздзеяння на працоўных. Кіномяханік—гэта агітатар. Ён выконвае важную функцыю па прапагандзе палітычных і навуковых ведаў. А, між тым, работа кіноперасовак і кіномяханікаў у многіх выпадках не звязваецца з канкрэтнымі палітычнымі і гаспадарчымі задачамі, што стаяць перад партыйнымі і совецкімі арганізацыямі раёна і вобласці. У рэспубліцы ўстанавілася няправільная практыка, калі кіноперасоўкі не маюць пастаянных маршрутаў, цвёрдых графікаў дэманстравання карцін у населеных пунктах. Гэтая работа пачынае толькі наладжвацца. Яна дала, напрыклад, добрыя вынікі ў Гарадоцкім раёне. У большасці-ж раёнаў кіноперасоўкі працуюць яшчэ не з поўнай нагрузкай, маршруты часта парушаюцца.

Да гэтага часу кіномяханікі былі прадастаўлены самім сабе, яны самі вызначалі маршрут кіноперасовак, імкнуліся папасці ў буйныя пункты, ігнаруючы дробныя населеныя пункты. Многія сёлы месяцамі і гадамі аб'язджаліся, і насельніцтва іх не бачыла кінокарцін.

Кіносеансы, як правіла, праводзіліся без падрыхтоўкі, і мясцовае насельніцтва даведвалася аб іх па стуку дзвіжка. Таму гледачы збіраліся выпадковыя, часам толькі дзеці.

Адсутнасць пастаянных маршрутаў стварыла дадатковыя цяжкасці ў рабоце кіноперасовак. Кіномяханік па пытаннях прадастаўлення транспарту вымушан быў мець справу не з двума-трыма старшынямі сельсоветаў, а з 8—12. Старшыня сельсавета не ведаў кіномяханіка, працуючага па пастаяннаму маршруту і цвёрдаму графіку, а, сустракаючыся з многімі кіномяханікамі, адносіўся да іх, як да людзей, якія выпадкова наведалі сельсавет. Такім кіномяханікам старшыні сельсоветаў не заўсёды прадастаўлялі транспарт.

Існаваўшая бескантрольнасць у рабоце раённых аддзелаў кінафікацыі, кіноперасовак і кіномяханікаў прыводзіла да зрыву рэгулярнага кіноабслугоўвання насельніцтва і нават раскрадання дзяржаўных сродкаў. У радзе выпадкаў кіноперасоўкі захапілі ў свае рукі прайдзісветы і жулікі, якія выкарысталі дзяржаўную кінаапаратуру як сродак для сваёй асабістай нажывы.

— Райкомы партыі,—прадаўжае дакладчык,—упусцілі з сваіх рук работу кіноперасовак. Справу кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва партыйныя арганізацыі павінны ўзяць у свае рукі. Важнейшай задачай партыйных арганізацый у масава-палітычнай рабоце на сяле з'яўляецца забяспечанне паказу кінокарцін ва ўсіх населеных пунктах рэспублікі. Неабходна арганізаваць справу так, каб усе кіноперасоўкі былі замацаваны за сельсоветамі, мелі пастаянныя маршруты руху па населеных пунктах, мелі расклад па днях і чыслах, у якім населеным пункце і ў які час даюцца сеансы.

Пры саставленні маршрутаў трэба выходзіць з неабходнасці замацавання кожнай перасоўкі за сельскімі советамі, каб у кожным калгасе рэспублікі кінофільмы дэманстраваліся два—тры разы ў месяц, а ў тых калгасах, дзе ёсць клубы і кінотэатры, кінофільмы павінны дэманстравацца не менш аднаго раза ў тыдзень. У вялікіх населеных пунктах павінна быць арганізавана па некалькі кіносеансаў адной і той-жа карціны, каб больш поўна ахапіць насельніцтва.

Асаблівую ўвагу звярнуў дакладчык на стан выхаваўчай работы сярод кіномяханікаў сельскіх перасовак. Справа палітычнага выхавання кіномяханікаў у большасці раёнаў пастаўлена зусім нездавальняюча. У райкомах КП(б)Б, як правіла, з кіномяханікамі не гутараць, не клапоцяцца аб іх палітычным росце. У Радашковіцкім раёне Маладзечанскай вобласці на працягу чатырох год ніхто з работнікаў райкома партыі ні разу не сабраў кіномяханікаў перасовак, не правёў з імі ніводнай гутаркі. Кіномяханікі гэтага раёна газет не чытаюць, не ведаюць, над якімі гаспадарчымі і палітычнымі задачамі працуе раённая партыйная арганізацыя.

Запушчанасць палітыка-выхаваўчай работы з кіномяханікамі сельскіх кіноперасовак зніжае ўзровень кіноабслугоўвання насельніцтва. Кіномяханікі ў многіх раёнах, атрымаўшы апаратуру і фільмакопіі, працуюць без належнага кіраўніцтва і кантролю.

Забяспечыць арганізацыю сістэматычнай работы з кіномяханікамі сельскіх кіноперасовак, няспынна клапаціцца аб іх ідэйным, культурным росце, вырошчваючы з іх сапраўдных агітатараў і прапагандыстаў, бліжэйшых памочнікаў партыйных арганізацый у масавай рабоце сярод насельніцтва,—неадкладная задача раённых камітэтаў партыі.

Рэзкай крытыцы падверг тав. Гарбуноў работу Міністэрства кінематаграфіі, якое нездавальняюча займалася падборам і выхаваннем кадраў кіносеткі і асабліва начальнікаў раённых аддзелаў кінафікацыі і кіномяханікаў. Заслухоўванне дакладаў на калегіі Міністэрства кінематаграфіі было фармальным, без напярэдняй глыбокай праверкі стану работы па месцах. Пастановы калегіі і загады міністэрства таму не ўскрывалі сапраўдных прычын дрэннай работы.

— Мінула больш месяца з дня апублікавання пастановы ЦК КП(б)Б,—указвае тав. Гарбуноў,—за гэты час прароблена значная праца па палепшанню кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва, але рэзкі пералом яшчэ не наступіў.

ЦК КП(б)Б гэтымі днямі заслухаў справаздачу сакратара Кіраўскага райкома партыі тав. Петрушэні аб выкананні пастановы ЦК КП(б)Б «Аб стане і мерах па палепшанню кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва рэспублікі» і адзначыў, што райком партыі не выканаў галоўнейшага патрабавання ЦК КП(б)Б аб тым, каб райкомы КП(б)Б разглядалі забяспечанне паказу кінокарцін ва ўсіх населеных пунктах як важнейшую задачу ў масава-палітычнай рабоце на сяле. Райком КП(б)Б не выканаў таксама ўказанняў ЦК КП(б)Б аб тым, каб у кожным калгасе і сяле фільмы дэманстравалі два—тры разы ў месяц, а ў тых калгасах, дзе ёсць клубы і кінотэатры—не менш аднаго раза ў тыдзень.

У рэспубліцы ўсё яшчэ назіраюцца выпадкі парушэння маршрутаў, непрадастаўлення транспарту для перавозкі кінаапаратуры і памяшканняў для дэманстрацыі фільмаў. У вёску Камароўка Кіраўскага раёна два разы прыбывалі кіноўстаноўкі з кінокарцінамі «Багатая нявеста» і «Падзенне Бярліна» і абодва разы вярталіся, бо не было прадастаўлена памяшканне. Прыведзеныя факты сведчаць аб адсутнасці рэзкага і каранных палепшання справы кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва.

— Перад партыйнымі, совецкімі органамі і работнікамі кінафікацыі рэспублікі,—гаворыць тав. Гарбуноў,—стаіць адказная і высокародная задача—выкарыстаць усю сілу духоўнага ўздзеяння кіно на ўзняцце палітычнай і працоўнай актыўнасці мас, на барацьбу за далейшы росквіт эканомікі і культуры, за ўздым і павышэнне добрабыту працоўных.

* * *

Першым у спрэчках па дакладу выступіў сакратар Баранавіцкага абкома КП(б) Беларусі тав. **Ажгірэй.** Ён адзначыў, што рашэнне ЦК КП(б)Б на пытанню палепшання кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва з'яўляецца баявой праграмай. Яна намячае практычныя шляхі палепшання дзейнасці партарганізацый на гэтым вельмі важным і складаным участку ідэалагічнай работы.

Баранавіцкі абком партыі прыняў цяпер разгорнутае рашэнне па пытанню кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва і палепшанню работы органаў кінафікацыі.

Начальнік Маладзечанскага абласнога кіраўніцтва кінафікацыі тав. **Нецвятаеў** паведаміў у сваім выступленні, што абком партыі і аблвыканком правялі абласную нараду кінаработнікаў з удзелам дырэктараў сельскіх дамоў культуры. Перагледжаны кадры начальнікаў раённых аддзелаў кінафікацыі. Праведзена работа па падрыхтоўцы кінатэатраў і дамоў культуры да работы ў зімовых умовах.

— Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі,—сказаў у сваім выступленні намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Быхаўскага РК КП(б)Б тав. **Кузмянкоў,**—правільна і своечасова ўскрыў сур'ёзныя недахопы ў пастаноўцы кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва. Органы Галоўкінопраката з вялікім спазненнем прысылаюць некаторыя фільмы ў раён. Кінофільм «Кубанскія казакі» нам не далі да гэтага часу. Фільм «Сталінградская бітва» яшчэ не паказаны ў нашым раёне. Пажадана, каб органы кінопраката за месяц уперад паведамлялі нам, якія будуць прысланы кінофільмы. І мы маглі-б арганізаваць прапаганду вакол гэтых фільмаў. Трэба, каб калгаснікі загадзя ведалі, які фільм і калі будзе дэманстравацца.

Станоўчым вопытам работы падзяліўся з удзельнікамі нарады загадчык аддзела кінафікацыі Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці тав. **Саломенскі.**

— Каляктыў Гарадоцкага раённага аддзела кінафікацыі,—сказаў Саломенскі,—пры дапамозе раённай партыйнай арганізацыі дабіўся сур'ёзнага палепшання ў кіноабслугоўванні сельскага насельніцтва. Дзякуючы тэхнічнай падрыхтаванасці кіномяханікаў і матарыстаў за мінулы год і за 9 месяцаў гэтага года не было ніводнага прастою і ніводнай аварыі. Калгаснікам за 9 месяцаў паказана 66 фільмаў. Такія фільмы, як «Сталінградская бітва», «Мічурын», «Канстанцін Заслонаў» і рад іншых, прайшлі з вялікім поспехам. Мы значна перавыканалі дзевяцімесячны план ахопу гледачоў. А такія мяханікі, як Тураўскі, Іванькоў, у верасні месяцы выканалі гадавы план і цяпер працуюць у лік 1951 года. Астатнія кіномяханікі выканаюць гадавы план не пазней 7 лістапада. Асаблівую ўвагу мы звяртаем на рэкламу кінокарцін, выкарыстоўваем для гэтай мэты друк і радыё. Усё гэта садзейнічае палепшанню кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва.

Раённы аддзел кінафікацыі мае пастаянную сувязь з мясцовымі партыйнымі і совецкімі арганізацыямі, абапіраецца ў сваёй рабоце на сельскі актыў з ліку інтэлігенцыі і калгаснікаў, які дапамагае кіномяханікам у правядзенні масава-палітычнай работы. Нашы кіноперасоўкі прымаюць актыўны ўдзел ва ўсіх палітычных кампаніях. У нас ёсць свая комсамольская арганізацыя. Усе кіномяханікі і матарысты—комсамольцы. Наш раённы аддзел трэці год трымае пераходны чырвоны сцяг абласнога кіраўніцтва кінафікацыі. Кіномяханікі тры разы былі на нарадах у Маскве. Нядаўна яны ўзнагароджаны ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ.

Сакратар Рагачоўскага райкома КП(б)Б Гомельскай вобласці тав. **Крапотава** ў сваім выступленні спынілася на слабай сувязі паміж Міністэрствам кінематаграфіі БССР, органамі Галоўкінопраката і раённымі арганізацыямі. Паказ кінокарцін у многім залежыць ад кваліфікацыі кіномяханікаў. У раёне цяпер арганізавана тэхнічная і палітычная вучоба кіномяханікаў. Палітычнай вучобай кіруе загадчык аддзела прапаганды райкома партыі, а тэхнічнай вучобай—лепшы кіномяханік тав. Слесараў. Адпак Міністэрства кінематаграфіі БССР не забяспечыла кіномяханікаў неабходнымі дапаможнікамі.

Увядзенне пастаянных маршрутаў, — сказаў у сваім выступленні кіномяханік Асіповіцкага раёна тав. **Пікала,**—значна палепшыла пастаноўку кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва.

Цяпер у мяне складзен цвёрды графік і пастаянны маршрут, у які ўключана 10 населеных пунктаў двух сельсоветаў. Гэта падае маёй рабоце мэтанакіраванасць і ўпэўненасць. За 15 дзён гэтага месяца ў некаторых населеных пунктах я змог паказаць па дзве кінокарціны і выканаў месячны план. Праўда, ёсць у нас такія населішчы, як Свіслач і сельсавет Касьеўскі, дзе можна дэманстраваць кінофільмы не два разы, а 4 і 5 разоў у месяц. Там на сеансах прысутнічае па 150—200 гледачоў. Нядрэнна было-б даваць у такіх населішчах па два-тры сеансы за адзін прыезд.

Цвёрды графік і пастаянны маршрут дае мне тую перавагу, што я маю магчымасць працаваць з насельніцтвам, паведамляць яму загадзя аб дні кіносеансаў. І вось да майго прыезду насельніцтва, якое жыве нават у двух-трох кіламетрах, ужо прыходзіць у кіно і чакае мяне. Ды я цяпер не магу спазняцца і парушаць графік. Насельніцтва верыць мне і чакае кінокарціну. Вось што дае цяпер работа кіномяханіка па-новаму.

Я маю патэфон і перад пачаткам кожнага кіносеанса праігрываю па некалькі пласцінак. Было-б добра, калі-б у кожнага кіномяханіка быў-бы патэфон. Гэта прыносіць вельмі вялікую карысць у палепшанні кіноабслугоўвання насельніцтва. Міністэрству кінематаграфіі не трэба баяцца затрат на набыццё патэфонаў для кожнай кіноперасоўкі. Гэтыя затраты сябе апраўдаюць за кароткі час.

Перад пачаткам кінокарціны трэба пазнаёміць насельніцтва з яе зместам. Некаторыя кіномяханікі могуць добра расказаць змест кінокарціны, а некаторыя не. Трэба даваць якое-небудзь апісанне кінокарцін. Цяпер, пасля рашэння ЦК КП(б)Б, у кожнай вёсцы ёсць кіноарганізатар. Калі было-б апісанне кінокарцін, то гэтыя арганізатары знаёмілі-б з ім насельніцтва. Але такіх апісанняў міністэрства і Галоўкінопракат кіномяханікам яшчэ не даюць.

Начальнік Брэсцкага абласнога кіраўніцтва кінафікацыі тав. **Южная** прывяла ў сваім выступленні рад прыкладаў няўважлівых адносін да работнікаў кіно з боку некаторых райкомаў партыі. Райкомы партыі і райвыканкомы недастаткова яшчэ дапамагаюць у падборы кадраў кінафікацыі, часта адрываюць іх ад асноўнай работы на ўсякага роду камандзіроўкі.

Сакратар ЦК ЛКСМБ тав. **Позняк** прысвяціў сваё выступленне рабоце комсамольскіх арганізацый рэспублікі ў галіне палепшання кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва і крытыкаваў работу Міністэрства кінематаграфіі БССР і Галоўкінопраката за слабае прасоўванне на экран фільмаў на маладзёжную тэматыку і навукова-папулярных.

— Міністэрства кінематаграфіі БССР і Галоўкінопракат, — гаворыць тав. Позняк,—дрэнна ўлічваюць крытыку, не прыслухоўваюцца да голасу комсамольскіх арганізацый і моладзі. На працягу трох год Міністэрства кінематаграфіі БССР і Галоўкінопракат крытыкуюцца на пленумах ЦК комсамола, на комсамольскіх канферэнцыях, на пленумах партыйных камітэтаў за тое, што на экранах рэспублікі мала дэманструецца кінофільмаў на маладзёжную тэматыку. Аднак да гэтага часу нічога не зроблена для выпраўлення гэтых недахопаў. У рэспубліцы да гэтага часу мала дэманструюцца карціны, якія дапамаглі-б выхоўваць у нашай моладзі такія якасці, як смеласць, бясстрашша, гатоўнасць пераадольваць любыя цяжкасці на шляху да мэты. Такія фільмы, як «Зоя», «Аповесць аб сапраўдным чалавеку» і многія іншыя, зніклі з экранаў, а гэтыя фільмы не ўся моладзь праглядзела. На базах Галоўкінопраката ёсць фільмы на навукова-папулярныя тэмы і вучэбныя фільмы, але справа дэманстрацыі такіх фільмаў не ўпарадкавана. Навуковыя і дакумэнтальныя фільмы не ўключаны ў рэпертуар кіноперасовак. Ёсць фільмы па фізкультуры. Яны-б маглі стаць сур'ёзнай падмогай у комсамольскай рабоце, у рабоце па выкананню пастановы ЦК партыі па пытаннях палепшання масава-фізкультурнай і спартыўнай работы, але ад вырашэння гэтых пытанняў Міністэрства кінематаграфіі БССР і Галоўкінопракат адыходзяць вельмі далёка.

У Міністэрства і Галоўкінопраката няма штодзённай сувязі з жыццём, з вырашэннем тых практычных задач, пад ажыццяўленнем якіх працуюць партыйныя, комсамольскія і грамадскія арганізацыі рэспублікі.

У спрэчках таксама выступілі міністр кінематаграфіі Беларускай ССР тав. **Садковіч,** сакратар Бабруйскага абкома КП(б)Б Беларусі тав. **Красоўскі,** начальнік рэспубліканскай канторы Галоўкінопраката тав. **Каржыцкая,** кіномяханік Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці тав. **Лупянкоў,** нам. старшыні выканкома Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных тав. **Сяргейчык,** начальнік Галоўнага кіраўніцтва кінафікацыі Міністэрства кінематаграфіі Саюза ССР тав. **Давыдаў,** сакратар Капыльскага РК КП(б)Б тав. **Белаусаў,** загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Іванаўскага РК КП(б)Б тав. **Літвінаў** і другія—усяго 21 чалавек.

* * *

На нарадзе з вялікай прамовай выступіў першы сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. **Н. С. Патолічаў.**

— Пастанова ЦК КП(б)Б аб стане і мерах па палепшанню кіноабслугоўвання сельскага насельніцтва,—сказаў тав. Н. С. Патолічаў,—знаходзіць шырокую падтрымку сярод працоўных Беларусі, і трэба меркаваць, што мы агульнымі намаганнямі пераадолеем усе цяжкасці і недахопы, якія ёсць у гэтай справе. Наша партыя разглядае кіно, як важнейшую і найбольш даступную для шырокіх мас насельніцтва форму ідэйна-палітычнага выхавання. На жаль, у нас у рэспубліцы многія работнікі яшчэ не разумеюць велізарнага значэння кіно ў справе комуністычнага выхавання працоўных і не жадаюць ім як належыць займацца.

Далей тав. Патолічаў падрабязна спыніўся на недахопах у кіноабслугоўванні насельніцтва і ўзяў пад суровую крытыку работнікаў, дапускаючых няправільныя адносіны да кіно. Асабліва сур'ёзныя недахопы мелі месца ў рабоце кіноперасовак у Пінскай і Баранавіцкай абласцях. Так, у Лагішынскім раёне Пінскай вобласці кіноперасоўкі трапілі ў рукі недастойных людзей. У сёлах Баранавіцкай вобласці кінокарціну «Мічурын» змаглі праглядзець некалькі сот чалавек.

— Як паказвае наша нарада, — сказаў далей тав. Н. С. Патолічаў, — пастанова ЦК КП(б)Б адзначыла толькі найбольш істотныя недахопы. Таварышы, якія выступілі тут, пералічылі значна больш недахопаў. Наша задача заключаецца ў тым, каб пераадолець і надалей не дапускаць іх. Гутарка цяпер ідзе аб тым, каб навесці парадак у кінафікацыі, у дзейнасці ўсіх органаў кінафікацыі з тым, каб кіно—гэты магутны, найбольш масавы і даступны сродак комуністычнага выхавання працоўных—было поўнасцю выкарыстана.

ЦК КП(б)Б прапануе ўстанавіць для кожнай кіноперасоўкі зусім строгі, чоткі маршрут, каб было вядома, якога чысла і ў якім калгасе дэманструецца кінокарціна. Больш таго, мы лічым зусім неабходным, каб гэтаму калгасу і кіномяханіку прынамсі за два тыдні паведамлялі, якая карціна будзе дэманстравацца, каб аб ёй загадзя было паведамлена і можна было-б рэкамендаваць адпаведную літаратуру, а работнікі, якія дапамагаюць кіномяханікам, маглі-б адпаведна падрыхтавацца. Можна і трэба зрабіць усё неабходнае, каб і кіномяханікі і гледачы былі падрыхтаваны да прагляду карціны.

Цяпер у Беларусь будзе паступаць 60 копій кожнай кінокарціны. Значыць, кожная новая кінокарціна будзе дэманстравацца адразу ў 60 кінотэатрах нашай рэспублікі. Міністэрства кінематаграфіі СССР дае нам у гэтым годзе звыш 100 новых кіноперасовак. У будучым годзе для Беларусі запланавана атрыманне больш 400 кіноперасовак. У нас у рэспубліцы ёсць цяпер больш 5 тысяч копій кінокарцін 430 назваў. Апрача гэтага, ёсць звыш 100 назваў часопісаў, дакумэнтальных кінокарцін і г. д. Я думаю, што калі па-большэвіцку аднесціся да пытання кіноабслугоўвання насельніцтва, то такой велізарнай колькасцю кінокарцін можна добра манеўраваць.

Работу органаў кінафікацыі трэба палепшыць пачынаючы з кіномяханікаў і канчаючы Міністэрствам кінематаграфіі БССР. Побач з крытыкай недахопаў у дзейнасці Міністэрства кінематаграфіі БССР яго мясцовых органаў трэба падтрымліваць іх, дапамагчы ім заняць тое месца ў грамадскім жыцці, якое належыць ім па праву. Неабходна выхоўваць кіномяханікаў, каб яны разбіраліся ў ідэйным змесце кінофільмаў, маглі адказваць на пытанні гледачоў. Гутарка ідзе аб тым, каб сур'ёзна ўзняць дзейнасць усёй сістэмы кінафікацыі рэспублікі. ЦК КП(б)Б надае велізарнае значэнне вырашэнню гэтай задачы.

У заключэнне тав. Н. С. Патолічаў звярнуўся да ўдзельнікаў нарады з просьбай рашуча палепшыць кіноабслугоўванне сельскага насельніцтва. Гэта будзе садзейнічаць справе комуністычнага выхавання працоўных, справе ўздыму народнай гаспадаркі і культуры Беларусі. Гэта дапаможа больш паспяхова вырашыць усе задачы, якія стаяць перад комуністычнай партыяй большэвікоў Беларусі, перад усімі працоўнымі Беларускай рэспублікі.

З вялікім уздымам удзельнікі нарады прынялі прывітанне лепшаму другу беларускага народа, вялікаму правадыру і настаўніку таварышу І. В. Сталіну.

Пятрусь БРОЎКА

Стася

Побліз Віслы хаціна,
Пры хаціне садок.
Маладая палячка
Заплятае вянок.

За раку паглядае,
Быццам вішня сама, —
А яго ўжо не чутна,
А яго ўсё няма.

Сталі яблыні вышай
У гамонцы лістоў,
Ужо шостая весна,
Як на захад пайшоў.

Час яму-б і вярнуцца,
Хоць паход і цяжкі —
Немалая-ж дарога
Аж з-пад Волгі-ракі.

Стася хлопца чакае,
Хоць мінаюць гады...
Чым запаў ён у сэрца,
Той салдат малады?

Мо' таму, што з напасці
Бацькаў вызваліў дом,
Мо' таму, што спяваў ён,
Ну, нібы салаўём.

Мо' таму, што быў просты,
Як струмень яснаты,
Мо' таму, што быў дужы,
Як са сталі зліты.

Помніць — кветкі дарыла,
Многа часу з таго...
Што-ж тады не сказала,
Хоць-бы слова свайго.

Шкода,
Цяжка, дзяўчына,
Ды скажы ты: бывай!—
Ён вярнуцца не можа,
Ты яго не чакай.

Ён загінуў, каб сёння
Кожны ў радасці жыў —
Ён дзіця над Бярлінам
Да грудзей прытуліў.

Перад ім яшчэ хмурыць
І грыміць далячынь.
Ён стаіць-жа спакойны
І рука на мячы.

У дні 33-й гадавіны

У святочныя дні тэатры рэспублікі пакажуць новыя спяктаклі, лепшыя пастаноўкі сязона і асноўнага рэпертуара.

Тэатр імя Янкі Купалы 5 лістапада выпускае спяктакль «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы (пастаноўка К. Саннікава, мастакі І. Ушакоў і А. Хашкоўскі, кампазітар Р. Пукст).

У галоўных ролях: народныя артысты БССР Г. Грыгоніс, Ул. Дзядзюшка, І. Ждановіч, Л. Ржэцкая, заслужаныя артысты П. Іваноў, Л. Кашэльнікава, Б. Кудраўцаў, В. Пола, С. Станюта, І. Шаціла і іншыя.

На асноўнай сцэне і ў Мінскім Доме афіцэраў будуць пастаўлены «Цытадэль славы», «Калінавы гай» і «Паўлінка».

Тэатр імя Якуба Коласа таксама падрыхтаваў да свята прэм'еру «Пяюць жаваранкі». Пастаноўка рэжысёра М. Міцкевіча. Мастак С. Нікалаеў.

Асноўныя ролі выконваюць: народны артыст СССР П. Малчанаў, народны артыст рэспублікі А. Ільінскі, заслужаныя артысты А. Шэлег, А. Трус, артысты З. Канапелька, Т. Заранок, М. Сянько і інш.

Рэспубліканскі рускі тэатр рыхтуе для паказу ў сваім новым будынку прэм'еру п'есы В. Палескага «Песня нашых сэрцаў» (пераклад Б. Лаўранёва).

Спяктакль ставіць галоўны рэжысёр тэатра С. Уладычанскі, мастак А. Марыкс.

У галоўных ролях выступяць народныя артысты БССР А. Абуховіч і Д. Арлоў, народны артыст Узбекскай ССР Г. Качаткоў, заслужаныя артысты рэспублікі А. Кістаў, Е. Палосін і іншыя.

У святочныя дні мяркуецца таксама паставіць новы спяктакль — «Два лагеры» А. Якабсона.

Тэатр оперы і балета рыхтуе да паказу 5, 7 і 8 лістапада спяктаклі «Царская нявеста», «Князь Ігар» і «Прададзеная нявеста».

З канцэртамі па новай праграме ў дні Вялікага Кастрычніка выступяць калектывы філармоніі, эстрады, мастацкай самадзейнасці сталіцы і рэспублікі.

Перадсвяточны кінофестываль

У Мінскім Акруговым доме афіцэраў праходзіць кінофестываль, прысвечаны 33-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Дэманструюцца кінофільмы «Сталінградская бітва» (1-я і 2-я серыі), «Падзенне Бярліна» (1-я і 2-я серыі), «Сустрэча на Эльбе» і іншыя.

У фае кіноканцэртнай залі наладжана выстаўка на тэму: «Трыццаць тры гады Совецкай дзяржавы», «Барацьба совецкага народа за выкапанне пасляваеннай пяцігодкі».

Песня жыццю

У ліпені 1947 года ў рэдакцыю Баранавіцкай абласной газеты «Чырвоная звязда» прышоў ліст трохкутнікам. Распячатаўшы яго, мы знайшлі не звычайны ліст у рэдакцыю, а дробныя радкі вершаў.

А праз некалькі дзён на старонках газеты гэтыя вершы былі надрукаваны пад рубрыкай «Вершы сялянкі Ганны Аляхновіч». У першым з іх—«Родная краіна»—сялянская паэтэса шчыра і задушэўна гаварыла пра сваю любоў да роднай краіны, дзе жыта цвіце дыванам, дзе наш Купала кінуў людзям зярняты песень, дзе звініць над палямі песня калгасніц. У другім — «На магіле партызана»—паэтэса смуткавала па тых, хто аддаў жыццё за Радзіму. Але на безымянную магілу Ганна Аляхновіч прышла не толькі са смуткам, яна прышла як паплечніца партызан па барацьбе. Таму і песня, якую яна паклала вянком на магілу, поўна веры ва ўрачыстасць жыцця, у неўміручасць справы, за якую «хлопцы-партызаны» аддалі жыццё:

Ці праўда тое, а можа я сніла,
Што з імі па лесе на бітвы хадзіла?
Няпраўда, што сном яны вечным паснулі,
Не ўцялі іх сэрцаў варожыя кулі.
Яны-ж, партызаны, свой край баранілі, —
Не возьме, не ўтоіць іх морак магільны.

Так шасцідзесяцігадовая сялянская жанчына з вёскі Нялепава, што пад Нясвіжам, зрабіла свой першы крок у літаратуры.

А да гэтага ляжаў доўгі жыццёвы шлях. Пачаўся ён са службы пакаёўкі ў фальварку пана Слізня на Гродзеншчыне. Нялёгкі быў гэты пачатак самастойнага жыцця, пачатак пакут, які яна нарэшце не вытрымала і, нават не атрымаўшы грошай, што належалі ёй, уцякла ў Кіеў. Працавала афіцыянткай у студэнцкай сталоўцы. У рэдкія вольныя хвіліны любіла зазірнуць у інтэрнат да студэнтаў Уладзімірскага універсітэта. Дзень і ноч, здавалася, слухала-б Ганна разумныя словы. Добрыя людзі былі сярод студэнтаў. Яны і навучылі простую сялянскую дзяўчыну грамаце, прышчапілі ёй любоў да кнігі, і з таго часу яна ўжо не расставалася, як з самым лепшым і разумным сябрам, з кнігай.

Потым бежанства, Петраград. Работа ў друкарні на Гатчынскай вуліцы. Запомнілася Ганне Вера Васільеўна Хадунова, у якой яна служыла хатняй работніцай. Разумная руская жанчына не перашкаджала імкненню дзяўчыны да ведаў. Яна нават спрыяла знаёмству яе з рабочымі рэвалюцыйнага Піцера. Ганна нярэдка бывала на рэвалюцыйных сходах. Але асабліва запомніўся маладой беларускай сялянцы 1918 год. Яна тады бачыла Уладзіміра Ільіча. Спецыяльна хадзіла да палаца Кшасінскай слухаць яго.

— Мне здаецца, я і зараз чую яго,— часта гаворыць Ганна.—Голас такі ласкавы, але і няўмольна суровы, калі ён гаварыў аб ворагах рэвалюцыі.

Ішлі гады. Падзеі апярэджвалі падзеі. Ганна вярнулася ў роднае Нялепава. Тады маладая Чырвоная Армія змагалася з беларускімі інтэрвентамі. Імкнучыся хоць трохі дапамагчы краіне, Ганна пайшла ў Чырвоную Армію. Потым вярнулася зноў дахаты. Беларускія акупанты, захапіўшы спрадвечныя беларускія землі, насаджалі там акупацыйны рэжым. Сталася так, што Ганне ізноў трэба было думаць пра кавалак хлеба. Дзе было ўжо там да паэзіі! Ды яна і не зусім выразна ўяўляла сабе, што такое паэзія, хоць само сэрца прасіла песні, а вусны часта шапталі яе. І гэтая паднявольная песня вылівалася ў пратэстуючы напеў душы.

Нарэшце настаў вераснёўскі ранак 1939 года, калі танкі, што ішлі з Усходу, сваім грукатам абвясцілі волю. Ганна знаходзілася ў нясвіжскай больніцы, прыкутая хваробаю да ложка. Невыказнай была яе радасць, калі яна праз шыбу больнічнага акна пабачыла палыханне чырвоных сцягоў. Сонца, здавалася, загарэлася ярчэй, і яго восеньскія промні сталі больш ласкавымі.

Але неўзабаве цёмнай хмарай з захаду насунулася нямецка-фашысцкая ноч. Ганна не змагла выбрацца на Усход. Але яна не змірылася і, як магла, помсціла фашысцкім цемрашалам. Яна пісала сардэчныя гнеўныя радкі вершаў, друкавала іх у партызанскіх газетах. Працавала сувязной. А вершы яе ішлі ў народ, як заклік, як песня да барацьбы. Многія з іх сталі народнымі.

Ганна не магла скарыцца і пакорліва несці ярмо няволі. І тое, што яна схавала ў сябе дарагую шыльду з будынка сельсавета,—гэта не проста факт. Гэта адзнака любві да совецкай Радзімы. На шыльдзе-ж быў герб роднай дзяржавы! І тое, што Аляхновіч прытуліла ў сябе і дагледзела параненага партызана, камандзіра дыверсійнай групы Мішу Шаршнёва,—хіба гэта толькі просты факт мацярынскай любві? Не! Гэта жаданне хоць-бы трохі дапамагчы Радзіме ў барацьбе супроць нямецка-фашысцкіх акупантаў.

... У канцы 1949 года ў Нялепаве адбылася вялікая падзея—сяляне аб'ядналіся ў сельгасарцель і назвалі яе вялікім імем палымянага трыбуна рэвалюцыі Сяргея Міронавіча Кірава. Ганна была адным з арганізатараў калгаса. З шчырай радасцю яна напісала тады ліст у рэдакцыю: «Вось цяпер я калгасніца, і пішу пра гэта ў рэдакцыю, каб ведалі ўсе, што мы, нялепаўскія сяляне, выйшлі на шлях новага жыцця, паказаны вялікім Сталіным».

Кожны дзень у працы і ў клопаце жыве Ганна Аляхновіч. Яна—член праўлення арцелі, актывіст і нястомны агітатар за калгаснае жыццё. А вечарамі яна сядзіць, схіліўшыся над аркушам паперы, і шукае такіх слоў, якія-б проста і зразумела гаварылі пра радасць новага калгаснага жыцця. А словы тыя ідуць ад сэрца, ад вялікага жыцця, пражытага чалавекам.

Совецкая рэчаіснасць з'явілася натхняючым пачаткам творчасці простай сялянскай жанчыны. Але Ганна Аляхновіч заклапочана не толькі тым, як-бы напісаць добры верш. На паседжаннях праўлення, на агульных сходах яна выступае і гаворыць пра тое, што ў Нялепава прынёс калгас, клапоціцца аб будаўніцтве і аб яго ўмацаванні. Совецкая ўлада акрыліла і натхніла старую калгасніцу на песні, адкрыла ёй дарогу ў вялікае жыццё, у літаратуру.

Р. САБАЛЕНКА.

Ганна АЛЯХНОВІЧ

НОВЫЯ ВЕРШЫ

Мой заклік

О, дзе мне ўзяць магутных сіл,
Каб я магла падняць з магіл
Карэі змучанай сыноў,
Каб жыць маглі яны ізноў,
Каб моц сваю яны знайшлі,
Усталі і судзіць пайшлі
Забойцаў лютых, чужакоў
За смерць людзей,
за звон акоў,
За крык спакутаных дзяцей,
За гора ўсіх сваіх людзей.
Хай судзіць ворагаў вялікі суд,
Хай кару тыя панясуць,
Хто у чужым свайго шукае,
Людзей нявінных забівае.
Калоціць Індыю, В'етнам, —
Праклятыя будзе хай ён сам!
Народы свету знойдуць суддзяў,
Суровай карай іх асудзяць.
О, дзе агню ў радкі узяць,
Пажарам слоў усіх падняць,
Каб зразумелі заклік мой:
Каб свет здабыў ізноў спакой,
Амерыканкі каб пачулі,
І сэрцам кожная матуля
Адчула боль зямлі чужой;
Да тых далёкіх рубяжоў
Каб не пусціла маці сына
Таптаць зямлю чужой краіны.

Што ахвоціць нас да працы

Мо' хто хоча запытацца,
Што ахвоціць нас да працы?
Адкажу таму я зараз:
Сваіх сэрцаў мы пажарам
Размялі і спапялілі
Тых паноў, што нас тлумілі,
Вераснёваю нядзеляй
Усталі раніцай імглістай.
Раптам нешта загудзела,
Мы падумалі — фашысты.
Затрывожыліся людзі,
Пазіраюць з-за вуглоў:
А што будзе, а што будзе?
Каб іх ветрам размяло!
Але грук той быў з Усходу,
А машын — рады, рады,
І на кожным самаходзе
Сцяг чырвоны малады,
Увесь народ захваляваўся,
Усе пабеглі на спатканне.
Морак цемрадзі канчаўся,
Занялося волі ранне.
Вось што сёння ўсіх ахвоціць,
Будзіць нас цяпер да працы,
Дае сілы, дае моцы
На саміх сябе старацца.

Мае дубы

Я летась увосень на зорцы ўставала,
Пад дубам хадзіла ды жолуд збірала.
Градку ў гародзе рыдлёўкай скапала,
Грабелькамі гладка зямлю прычасала.
Жолуд садзіла, вадой палівала;
Каб холад не ўкрыўдзіў —
галлём прыкрывала.
Увесну на градку я часта хадзіла,
Чакала дубочкаў, што ўвосень садзіла.
Ой, доўга, ой, доўга яны ўсё маўчалі,
Я думала: можа, за зіму прапалі.
Позняй вясною расткі папускалі,
Лісткі маладыя мяне ўсхвалявалі.
Ой, будзе расці наш лясочак дубовы
Жыцця маладога магутнай асновай.
Мы сад свой калгасны абсадзім дубамі,
Нясвіжскі гасцінец. Каб вечна шчытамі,
Шумам галінаў людзям гаварылі —
У свята Кастрычніка іх пасадзілі.
Мы іх пасадзілі, каб памятку меці,
Каб нас спамянулі і ўнукавы дзеці.
Расціце-ж, дубочкі, высока, шырока,
Карэнне ў зямліцу пускайце глыбока.
Дужэйце, дубочкі, імкліва расціце,
Веццем зялёным на ветры шуміце,
Каб людзі пачулі і вас зразумелі,
Паселі у засень і песню запелі.

в. Нялепава Нясвіжскага раёна.

Па слядах нашых выступленняў

„АДНАВІЦЬ СЛУЦКУЮ БЭРУ"

У адказ на артыкул Э. П. Сюбаравай «Аднавіць слуцкую бэру», змешчаны ў нумары 40 (794) нашай газеты ад 30 верасня гэтага года, начальнік аддзела садаводства і пчалаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР Б. Хабенка паведамляе, што Міністэрствам прадпрыняты сур'ёзныя захады па ўліку і ахове дрэваў слуцкай бэры, якія захаваліся ў рэспубліцы пасля вайны. Дзяржаўнымі гадавальнікамі ўжо накіравана калгасам 5 тысяч саджанцаў слуцкай бэры. На 1951 год намечаны новыя мерапрыемствы па абследванню і выяўленню слуцкай бэры ў розных раёнах Беларусі.

Апрача таго, па заданню Міністэрства садова-агародныя станцыі праводзяць работу з мэтай палепшання гэтага гатунку груш, галоўным чынам, у напрамку прыдання ёй большай марозаўстойлівасці.



Новы кінотэатр «Перамога» ў Мінску.

Фота Г. Бугаенкі.

Страты і прыбыткі

Іў. КУДРАЎЦАЎ

Ці можа адзін і той-жа літаратурны герой па-рознаму гаварыць у двух выданнях аднаго твора? Аказваецца, можа. Дастаткова гэтаму твору прайсці праз рукі пэўнага перакладчыка, як у голасе героя з'яўляюцца новыя ноткі, знікаюць ранейшыя, мова яго набывае іншае гучанне.

Так здарылася з шолахаўскім Шчукаром з рамана «Узнятая цаліна», што нядаўна выйшаў у Дзяржаўным выдавецтве БССР на беларускай мове.

Чытачы добра памятаюць славутага дзеда Шчукара, памятаюць яго мову—своеасаблівую, аднаму толькі яму характэрную, багатую народнымі зваротамі, трапнымі словамі, прасякнутую гумарам. Але вось мы чытаем гэты класічны твор совецкай літаратуры па-беларуску і заўважаем: дзед гаворыць на «правільнай» літаратурнай мове, ярка індывідуалізаваны голас героя страціў багацце фарбаў.

Больш блізкае азнаямленне з раманам на беларускай мове сведчыць, што метамарфоза голасу Шчукара—не адзінае, чым адрозніваецца гэтае выданне ад рускіх выданняў. Непажаданыя сляды рукі перакладчыка трапляюцца амаль на кожнай старонцы твора. Узяўшыся за працу і не маючы на гэта колькі-небудзь сур'ёзных падстаў, да таго-ж нядбайна паставіўшыся да яе, перакладчык даў узор таго, як нельга абыходзіцца з творамі.

Галоўная загана перакладу «Узнятай цаліны»—у адсутнасці спалучэння дакладнасці з творчым падыходам да тэкста, а ў значнай ступені—у непісьменнай перадачы арыгінала па-беларуску.

«Так, должно быть, и буду **мотаться** по району уполномоченным»,—чытаем у рамане. Перакладчык перадае гэта наступным чынам: «Так, напэўна, і буду **матлянца** на раёне ўпаўнаважаным» (стар. 11). У другім месцы слова «мотаться», ужытае ў гэтым-жа значэнні, перададзена па-іншаму: «не на таких лошадках моталися» — «не на такіх конях **матаўся**» (стар. 12). На стар. 5 «попонка» (на каня)—«гунька», крыху далей тая-ж «попонка»—«папонка». У адным месцы «кушак»—«рамень», у другім—«папруга». «Аромат» перакладваецца «пах» (не ўсякі «пах»—«аромат»); «чернобыл» ператвораны ў «быльнёг».

Іншы раз перакладчык ужывае словы і звароты, што ні ў якія нормы граматыкі не ўкладваюцца. Вось некалькі прыкладаў непісьменных, нязграбных і недарэчных перакладаў: «...дробненькім **захлёбваючым шопатам** просіць...» (стар. 89), «...**Натоўпілася** чалавек сем казакаў» (стар. 12), «хлеб насущный» — «хлеб штодзённы», «паіла з **лаханкі** цяля», «прыгаршні мазоляў», «пиная лошадь ногами»—«піхаючы каня нагамі» (стар. 223), «невероятный скок»—«непамерны скок», «лукава прыжмурыўся», «знабіла холадам», «паблажліва ўсміхнуўся», «гусяткі желтые, завлекательные, и хочется коршуну ухватить **какого-нибудь...**» — «гусяняткі жоўтыя, прывабныя, і хочацца коршуну ўхапіць **каго-небудзь...**» (стар. 231), «Он был бы красив той **неброской**, по запоминающейся **мужественной** красотой, если бы...» — «Ён быў-бы прыгожы той **невыдатнай мужчынскай** прыгажосцю, якая запамінаецца, каб...» (стар. 13), «Эх, папаша!»—«Эх, дзядзька!» (стар. 221), «приосанился» — «спаважнеў» (стар. 223), «злосчастная кобылка»—«кабылка-небарака», «адхваціў» (стар. 222), «атаропеў» (стар. 222) і г. д.

Перакладчык вольна абыходзіцца са сказам, па свайму гледжанню ён аб'ядноўвае два сказы ў адзін, або наадварот—з аднаго сказа робіць два. Зрэдку гэта наглядаецца і ў адносінах абзацаў. Без усялякай на тое патрэбы змяняюцца і замяняюцца розныя словазвароты — прыслоўныя, дзеяпрыслоўныя, дзеяпрыметныя; заблытваючыся ў гэтых зваротах, перакладчык нярэдка адыходзіць ад арыгінала. Напрыклад: «Она (лиса) становилась в дыбки, извиваясь, прыгала вверх и, припадая на передние лапы, рыла ими, окутываясь сияющей серебряной пылью...» У перакладзе гэты сказ гучыць так: «Ён (ліс) станавіўся ўдыбкі, выкручваўся (?), скакаў угару і, прыпадаючы на пярэднія лапы, капаў імі, ахутваўся ззяючым срабрыстым пылам...» (стар. 11) і інш.

У выпадках-жа, калі трапляліся словы, цяжкія для перадачы па-беларуску, перакладчык ішоў па лініі найменшага супраціўлення—ён выкрэсліваў іх з тэкста. Напрыклад: «Поливали дождем ядовитых насмешек, **густо просоленных острот**» — «Палівалі дажджом уедлівых кпін, **жартаў**» (стар. 4) і інш.

Перакладчык часам адвольна надае словам іншае значэнне, змяняючы іх форму, скажам, адзіночны лік ператварае ў множны («...стрелять **не знаю** чем...»—«...страляць **не ведаем** чым...», стар. 4), блытае лады дзеясловаў («**направить** на путь сознательной борьбы» — «**накіроўваць** на шлях свядомай барацьбы», стар. 95).

Не адчуваючы, што пры літаральным перакладзе ў беларускай мове некаторыя словы маюць зусім не тое значэнне, што ў рускай, перакладчык піша: «... как-бы **про себя** рассуждал Гриша» — «... нібы **пра сябе** разважаў Грыша» (стар. 21); «круто **обернул** тулуп спинищею» (павярнуўся) — «крута **абярнуў** кажух спінішчаю» (стар. 18) і інш.

Дазваляе сабе перакладчык і такія вольнасці, як замену аўтарскіх інверсій, перастаноўку слоў. Напрыклад: «И на черепашьем скрипучем **ходу вагонном**, перемежая и побеждая ржавые песни колёс, несутся над равнинами песни борьбы...»—«І на чарапашым скрыпучым **вагонным хаду, у перамежку і заглушаючы іржавыя песні колаў** (?), нясуцца над раўнінамі песні барацьбы» (стар. 13).

І побач з гэтымі вольнасцямі і адступленнямі ад арыгінала — пераклады, накшталт: «**чуть** застыдился» — «**ледзь** засароміўся» (стар. 4), «шаршавая барада» (стар. 17), «неўмагату» (стар. 23), «**вяніна**» (стар. 28), «недоумение» — «**неўразуменне**» (стар. 97), «у натоўпе гнездзіліся перасуды» (стар. 5), «заиндевелые тулупы» — «задубелыя кажухі» (стар. 25), «удешевление рубля» — «**танасць** рубля» (стар. 208) і шмат іншых.

Хто-ж перакладаў «Чапаева» і «Узнятую цаліну»? На жаль, для чытача гэта невядома. Ні на адной з кніг прозвішчы перакладчыкаў не названы. Не сказана нават, што гэта — перакладзеныя з рускай мовы творы. Выдавецтва ўзяло за звычку «забываць» адзначаць імёны перакладчыкаў, указваць, з якога рускага выдання перакладваюцца творы, або якім па ліку беларускім выданнем яны выпускаюцца. На гэтыя абавязковыя элементы выдавецкай культуры чамусьці не звяртаецца ўвагі. Так, напрыклад, чытач не знойдзе імён перакладчыкаў у кнігах — «Казкі» М. Горкага, «Васёк Трубачоў і яго таварышы» В. Асеевай, «Выбраныя творы» В. Бялінскага.

Наконт «Чапаева» і «Узнятай цаліны» ў выдавецтве нам расказалі, што перакладчыкі іх наогул невядомы. Каб не рабіць грашовых выдаткаў, былі выкарыстаны даваенныя выданні гэтых твораў на беларускай мове, на якіх прозвішчы перакладчыкаў не названы. Бясспрэчна, такое выкарыстанне даваенных перакладаў зусім заканамернае. Але папярэдне работнікі выдавецтва абавязаны былі высветліць якасць гэтых перакладаў, устанавіць іх прыгоднасць для перавыдання. Не зрабіўшы ў дадзеных выпадках такой праверкі і маючы на ўвазе толькі адно — як мага менш рабіць грашовых выдаткаў, выдавецтва даручыла рэдагаванне «Чапаева» і «Узнятай цаліны» штатным малакваліфікаваным работнікам — Н. Лапіцкай і Л. Салаўю, якія не здолелі справіцца са сваімі складанымі задачамі. У выніку — выдавецтва атрымала чыстыя прыбыткі, а два класічныя творы совецкай літаратуры пры перавыданні па-беларуску панеслі значныя **страты**.

Час выдавецкім кіраўнікам зразумець, што Дзяржаўнае выдавецтва БССР — не камярцыйная кантора, у якой на першы план пастаўлена атрыманне прыбыткаў, а дзяржаўная ўстанова, у працы якой асноўным павінна быць выданне высокакласных у ідэйна-мастацкіх адносінах кніг — зброі комуністычнага выхавання масавага чытача.

Час нарэшце зразумець, што друкаванне на роднай мове твораў братніх літаратур—справа надзвычай важная і адказная, і нельга яе пускаць на самацёк або даручаць недасведчаным людзям.

Лісты ў рэдакцыю

Забыты абавязак

У нашай літаратуры вельмі мала твораў аб працоўных буднях Совецкай Арміі. Забыта гэтая тэма пісьменнікамі. Бясспрэчна, нашаму чытачу патрэбны не толькі творы аб працы рабочых і калгаснікаў, дзеячоў навукі, культуры і мастацтва, але і творы пра воіна і воінскую службу. Служба воіна ў радах Совецкай Арміі — ганаровы і пачэсны абавязак грамадзяніна Совецкага Саюза.

Пажадана, каб вядучае месца ў творах займаў перадавы воін, які авалодвае воінскім майстэрствам, загартоўвае сваю волю і пільна стаіць на варце Радзімы.

Совецкі воін варты таго, каб аб ім з'явіліся высокамастацкія творы.

І. ЛІТВІНЕНКА,
ваеннаслужачы.

З чаго ліха...

Каторы ўжо год праграма VIII класа па беларускай літаратуры прадугледжвае праходжанне народнай казкі «З чаго ліха на свеце». Але ў хрэстаматыі для VIII класа гэтай казкі няма. Праўда, у хрэстаматыі 1945 года (склаў М. Ларчанка) у канцы кнігі—у змесце значыцца: «З чаго ліха на свеце», стар. 35, але на адпаведнай старонцы надрукавана казка «Мужык і пан».

У трэцім выданні хрэстаматыі, хоць яно лічыцца «перапрацаваным і дапоўненым», казкі таксама няма.

Мы звярталіся да зборніка С. Васілёнка «Народная творчасць» (даваенны выпуск), але і там казкі няма, толькі невялічкая цытата прыведзена з казкі ў адным месцы.

Сапраўды, з чаго ліха?

З падобнымі загадкамі мы сустрэліся і ў падручніку па беларускай літаратуры для 8 класа.

У першым і «другім, выпраўленым» выданнях «Беларускай літаратуры», у артыкуле Л. Фіглоўскай аб паэме «Тарас на Парнасе» прыведзена вытрымка з паэмы аб Гебе:

«Яна ў страпухі ўзята ў неба,
Каб есць варыць і плацце мыць.
Нябось, на цяжкім жывець хлебе.
Ці штука-ж столькіх накарміць».
(2-е выданне, стар. 45).

У тэксце, які надрукаваны ў хрэстаматыях усіх паслявоенных выданняў, гэтых радкоў няма. Няма іх і ў асобным выданні ананімнай паэмы 1939 года.

У кнізе «Беларуская літаратура XIX ст.», выдадзенай Акадэміяй навук БССР у г. г., няма ўказанняў, што паэма друкуецца скарочана (аб «Сялянцы» Д.-Марцінкевіча і іншых творах такія ўказанні ёсць), гаворыцца толькі, што друкуецца яна па віленскаму выданню «Нашай хаты» 1909 года з нязначнымі рэдакцыйнымі зменамі. Аднак і тут прыведзеных вышэй радкоў няма. Выходзіць, што ёсць недзе больш поўная рэдакцыя паэмы «Тараса на Парнасе», якая ў зборніку, выдадзеным Акадэміяй навук, змешчана са скарачэннямі.

Растлумачце, у чым справа?

Васіль КАЛТУНОЎ.

Віцебская вобласць,
Талачынскі раён,
вёска Варанцовічы.

ПЕСНЯТВОРЦЫ

(З нарады самадзейных кампазітараў)

Гэтая нарада была незвычайнай: першай за ўсё жыццё нашай рэспублікі. Першай і нешматлюднай. З усёй Беларусі прыехалі дваццаць тры чалавекі. Сярод іх — калгасныя актывісты, чыгуначнікі, педагогі, ваенныя. Людзі розных узростаў і розных прафесій. Але ўсіх іх яднае вялізнае жаданне тварыць адну і тую-ж справу — песню. Яны не канчалі кансерваторый, нават не ўсе ведаюць нотную грамату, не ўсе ўмеюць перакладаць на ноты створаныя імі мялодыі, тым не менш, іх па праву можна назваць кампазітарамі. Пакуль іх называюць «самадзейнымі кампазітарамі», укладаючы ў гэтае разуменне некаторую прафесійную недасканласць іх творчасці. Але ў самадзейных кампазітараў ёсць тое, што не можа замяніць ніякі, нават самы адмысловы прафесіяналізм, — глыбокае пачуццё народнасці. Многія з іх з'яўляюцца кіраўнікамі рабочых, калгасных, студэнцкіх самадзейных хораў. Яны праніклісся песнямі народа, прызвычаіліся да іх і навучыліся разумець, якую песню і музыку хоча спяваць сёння совецкі народ.

Адказваючы на запатрабаванне свайго народа, самадзейныя кампазітары самі пачалі складаць песні, правяраючы іх тут-жа, непасрэдна на сваіх слухачах, для якіх яны складаюць. І тое, што гэтыя песні ў большасці сваёй шырока ўваходзяць у рэпертуар самадзейных харавых калектываў, лепш за ўсё сведчыць аб таленавітасці іх аўтараў. Няхай гэтыя песні напісаны не па ўсіх канонах музычнай творчасці, у іх сапраўды мала яшчэ патрэбнага прафесіяналізма, але яны хвалююць сэрцы сваёй шчырасцю і праўдзівасцю, народ спявае іх і хоча спяваць.

А хіба гэта не самая лепшая ацэнка?

Маладыя кампазітары праверылі свае творы на народзе, які падказаў ім і думкі і мялодыі; зараз ім прадстаяла прайсці строгую і патрабавальную праверку старэйшых таварышаў па творчасці — прафесійных кампазітараў.

Нельга не зразумець тое хваляванне, з якім прыехалі ў Мінск народныя песнятворцы на свой першы творчы семінар, дзе кожны з іх будзе ацэнены адпаведна сваім здольнасцям. Саюз кампазітараў БССР падрыхтаваўся да гэтай ацэнкі. Кампазітар Ул. Алоўнікаў загадзя прааналізаваў творчасць бадай усіх удзельнікаў нарады і на самой нарадзе ён выступіў з іх падрабязнай характарыстыкай. Гэта быў не чарговы даклад на чарговую тэму аб самадзейнасці, а шчырая таварыская размова аб творчасці. Дакладчык, калі можна было яго назваць так, даводзіў свае думкі і перакананні сродкамі музыкі: ён праіграваў на піяніна творы ўдзельнікаў нарады і тут-жа камянтыраваў іх станоўчыя і слабыя бакі.

Такім-жа метадам карыстаўся і заслужаны дзеяч мастацтва Г. Цітовіч, калі праводзіў на нарадзе гутарку «Аб сучаснай песеннай творчасці беларускага народа». Гэтая творчасць паўстала перад слухачамі ў яркіх музычных вобразах, створаных народнымі каляктывамі і асобнымі народнымі песнятворцамі. Вялікае месца сярод іх занялі аўтары-самавучкі, удзельнікі творчай нарады. Многія з іх абавязаны сваімі поспехамі нястомнаму шукальніку народнага песеннага багацця — Г. Цітовічу. Вандруючы па рэспубліцы, ён сустракаў кампазітараў-самавучак, дапамагаў ім асэнсаваць свае творчыя імкненні і ўмацоўваў іх веру ў свае здольнасці. Ведаючы іх любоў да народнай песні і музыкі, Г. Цітовіч перадаў ім свой велізарны вопыт збіральніка сучаснага песеннага і музычнага фальклора.

Творчасць маладых кампазітараў ацэньвалі не толькі вядомыя дзеячы музыкі. Яе ацэньвалі і самі ўдзельнікі нарады. Кампазітары Я. Цікоцкі і М. Аладаў паставілі на абмеркаванне нарады творы яе ўдзельнікаў. Без прыдзірак, але сур'ёзна, па-таварыску пачынаючыя кампазітары сказалі адзін другому шчырую праўду аб тым, што добра і дрэнна ў асобных творах. Такая каляктыўная ацэнка амаль беспамылкова вызначыла месца кожнага маладога кампазітара ў песеннай творчасці народа.

Агульнае прызнанне атрымалі такія творы, як «Вядзі, правадыр» і «Табе, Беларусь» М. Ларкова (Капцэвічы), «Пад сцягам міру», «Мы працоўныя людзі» В. Багатава (Бабруйск), «Песні аб будоўлях комунізма» В. Смірнова (Віцебск), «Возера Нарач» М. Шуміліна (вёска Куковічы Капыльскага раёна), «Над Нёманам», «Жніво» — П. Шэўкі (Карэлічы), «Песня аб Сталінградзе» І. Мацціна (Гродна), песні Р. Галавасцікава, П. Шыдлоўскага і інш. Усе гэтыя творы нарадзіліся з глыбокіх вытокаў народных дум і пачуццяў і таму хвалююць сваім аптымізмам і сапраўднай народнасцю.

Удзельнікі нарады праслухалі свае песні ў выкананні хора Камітэта радыёінфармацыі. Нельга было не парадавацца, што рэпертуар хора ўзбагаціўся добрымі, сапраўды народнымі песнямі. Камітэт радыёінфармацыі, філармонія і эстрада пры жаданні даўным-даўно ўжо маглі ўзбагачаць свой рэпертуар з крыніц песеннай народнай творчасці. Трэба спадзявацца, што першая творчая нарада самадзейных кампазітараў пакладзе гэтаму плённы пачатак.

Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР набывае ўсе лепшыя творы самадзейных кампазітараў для шырокага распаўсюджвання іх сярод прафесійных і самадзейных мастацкіх каляктываў. У канцы гэтага года Кіраўніцтва мяркуе аб'явіць конкурс на напісанне самадзейнымі кампазітарамі сучасных песень.

Ажыццявіўшы вельмі карыснае мерапрыемства па скліканню рэспубліканскай нарады-семінара пачынаючых кампазітараў, Кіраўніцтва па справах мастацтва, Рэспубліканскі Дом народнай творчасці і Саюз совецкіх кампазітараў БССР павінны замацаваць гэты добры пачатак і разгарнуць працу па далейшаму выхаванню самадзейных кампазітараў і выяўленню новых кампазітарскіх сіл, колькасць якіх далёка не абмяжоўваецца трыма дзесяткамі чалавек, выяўленымі да гэтага часу.

Асабліва ўдзячная задача паўстала перад Саюзам кампазітараў. Зусім відавочна, што ёсць усе падставы прыняць у Саюз на меншай меры чалавек пяць асабліва дарадітых і творча актыўных самадзейных кампазітараў, выяўленых на нарадзе, а таксама і задоўга да яе. Кампазітарская арганізацыя БССР, якая за пасляваенныя гады не мела амаль ніякага колькаснага росту, зараз мае магчымасць напоўніць свае рады свежымі сіламі таленавітых народных песнятворцаў.

Сустрэча самадзейных кампазітараў з кампазітарамі БССР.
На здымку (злева направа): у першым радзе—Я. Цікоцкі, Ул. Алоўнікаў, Р. Галавасцікаў (Баранавічы), М. Аладаў, В. Багатаў (Бабруйск); у другім радзе—П. Шыдлоўскі (Уздзенскі р-н), М. Шуміліп (Капыльскі р-н), П. Шэўко (Карэліцкі р-н), С. Пячкоўскі (Слаўгарад). Фота Г. Бугаенкі.

На здымку: удзельнікі гуртка мастацкай самадзейнасці калгаса «Новае жыццё» Уваравіцкага раёна Гомельскай вобласці рыхтуюць новую святочную праграму.
Фота Л. Аркадзьева.

„М. Горкі за мір і дэмакратыю"

Пад гэтай назвай Інстытут сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага падрыхтаваў да друку зборнік выдатных публіцыстычных твораў вялікага пісьменніка, у якіх ён выкрывае ворагаў прагрэсіўнага чалавецтва і перш за ўсё амерыканскі імперыялізм, як самага злоснага ворага міру.

У зборнік уключаны артыкулы: «Адказ на анкету амерыканскага часопіса», «Аб цынізме», «Гуманістам», «З кім вы, «майстры культуры»?» і іншыя.

Памер зборніка—20 друкаваных аркушаў.

Новыя песні беларускіх кампазітараў

Рэпертуарная камісія Рэспубліканскага камітэта радыёінфармацыі прыняла новыя песні беларускіх кампазітараў да выбараў у мясцовыя Саветы.

Камісія ўхваліла песні Ул. Алоўнікава «Радзіма мая дарагая» і Я. Цікоцкага «Родны Сталін да шчасця вядзе» на тэксты А. Бачылы, Д. Лукаса «Выбарная» (на словы М. Машары) і «Наша мама—дэпутат» (тэкст Э. Агняцвет), Р. Пукста «Песня маладых выбаршчыкаў» на словы М. Калачынскага і масавую песню «Ад сёл калгасных» на тэкст К. Пуроўскага.

Прыняты да выканання: «Песня сэрца» М. Чуркіна на тэкст А. Суркова і змешаны хор «Пасяўная» на словы А. Прокоф'ева.

У абласной бібліятэцы

У Мазырскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна афармлена кніжная вітрына да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных.

Работнікі бібліятэкі падрыхтавалі для выбарчых участкаў горада літаратурны мантаж на тэму: «Совецкая літаратура ў барацьбе за мір і дэмакратыю».

НОВЫЯ КНІГІ

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі наступныя кнігі:

Рэдакцыя мастацкай літаратуры

Павел Кавалёў. «Аповесць пра добрае сэрца». Мастак В. Бундзін. Тыраж 10000 экз., стар. 128. Цана 3 руб. 50 кап.

Мікола Гамолка. «Б'юць куранты». Вершы. Вокладка мастака В. Бундзіна. Тыраж 4000 экз., стар. 128. Цана 3 руб.

Рыгор Няхай. «Маё пакаленне». Вершы. Тыраж 4000 экз., стар. 76. Цана 1 руб. 40 кап.

Нікалай Гарулёў. «Аднагодкі». Вершы на рускай мове. Вокладка мастака Н. Гуціева. Тыраж 4000 экз., стар. 136. Цана 3 руб. 50 кап.

Рэдакцыя музычнай літаратуры

М. Аладаў. «Рукавіцы». Для голаса з ф-на. Словы Э. Агняцвет. Тыраж 1000 экз., стар. 20. Цана 2 руб. 50 кап.

Д. Лукас. «Хоры з оперы «Кастусь Каліноўскі». Тыраж 1000 экз., стар. 12. Цана 1 руб. 50 кап.

П. Падкавыраў. «Спеў калгаснай дзяўчыны». Для жаночага хора. Словы П. Броўкі. Тыраж 330 экз., стар. 8. Цана 75 кап.

П. Падкавыраў. «Беларуская застольная». Для хора з ф-на. Словы Э. Агняцвет і А. Астрэйкі. Тыраж 350 экз., стар. 12. Цана 1 руб. 25 кап.

Купалаўскія чытанні

Купалаўскія чытанні, якія пачаліся ў кастрычніку па ініцыятыве ЦК ЛКСМБ і цэнтральнага лякцыйнага бюро Камітэта па справах культасветустаноў пры Совеце Міністраў БССР, будуць праходзіць у Мінску на працягу лістапада 1950 г.—студзеня 1951 г.

Тэмы чытанняў: «Паказ соцыялістычнага будаўніцтва ў творчасці Янкі Купалы», «Вобраз таварыша Сталіна ў творах народнага паэта», «Творчасць Янкі Купалы ў дні Вялікай Айчыннай вайны», «Янка Купала і беларуская совецкая літаратура», «Дарэволюцыйныя паэмы народнага паэта», «Паэтычнае майстэрства Янкі Купалы», «Янка Купала і беларуская совецкая паэзія».

З лекцыямі аб творчасці народнага песняра выступаюць беларускія пісьменнікі і крытыкі.

Новая работа пра Якуба Коласа

24 кастрычніка адбылося паседжанне камісіі па крытыцы Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

На паседжанні была абмеркавана работа Ю. Пшыркова пра Якуба Коласа.

Ва ўступным слове Янка Шарахоўскі даў кароткую характарыстыку твора крытыка, адзначыў яго недахопы.

Камісія па крытыцы станоўча ацаніла работу Ю. Пшыркова аб жыццёвым і творчым шляху народнага паэта і рэкамендавала яе да выдання асобнай кнігай.

У абмеркаванні прынялі ўдзел крытыкі М. Ларчанка, Ул. Агіевіч, М. Барсток і інш.

На наступным паседжанні камісіі па крытыцы будзе разгледжана работа М. Барсток — «Праблема станоўчага героя ў творчасці Якуба Коласа».

Зацверджанне праграмы-праспекта па гісторыі беларускага тэатра

Галоўнае Кіраўніцтва навучальных устаноў Камітэта па справах мастацтва пры Совеце Міністраў СССР зацвердзіла праграму-праспект па гісторыі беларускага тэатра. Раздзелы драматычнага тэатра напісаны крытыкамі А. Есаковым, М. Клімковічам і Ул. Няфёдам, раздзелы гісторыі беларускага музычнага тэатра — заслужаным дзеячом мастацтва БССР кампазітарам Я. Цікоцкім.

Праграма-праспект ахоплівае перыяд гісторыі беларускага тэатра ад XIII стагоддзя да нашых дзён, калі беларускае тэатральнае мастацтва дзякуючы Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі набыло шырокае развіццё.

Па гэтай праграме-праспекту ўпершыню ў Беларускім тэатральным інстытуце будзе выкладацца поўны курс гісторыі беларускага тэатра.

У мастакоў сталіцы

Мастакі сталіцы Совецкай Беларусі ў перадсвяточныя дні выканалі эскізы афармлення двух гарадскіх ансамбляў на тэмы: «СССР на новым магутным уздыме» і «СССР — аплот міру і дэмакратыі».

Распрацоўваюцца эскізы афармлення трох раённых калон школьнікаў і калоны фізкультурнікаў Мінска.

Для райпарткабінета Сталінскага раёна напісаны копіі з вядомых карцін: «Раніца нашай Радзімы», «Залп Аўроры» і «Ленін у Разліве».

Мастакі таксама прымаюць удзел у святочным упрыгожванні завода імя Кірава і калгаса імя Леніна Мінскага раёна.

Вечар нарыса

Кафедра тэорыі і практыкі совецкага друку Беларускага Дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна і навуковы студэнцкі гурток журналістыкі арганізавалі творчы вечар, прысвечаны нарысу. Пісьменнікі І. Грамовіч, А. Міронаў і Т. Хадкевіч расказалі аб сваёй працы над нарысам.

Члены студэнцкага гуртка Сурскі, Говар, Гольдзіна і іншыя выступілі з крытычнымі заўвагамі па нарысах беларускіх пісьменнікаў.

Літаратурны гурток у школе

У Казярожскай сямігадовай школе Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці створаны літаратурны гурток, якім кіруе малады пісьменнік Міхась Даніленка.

Лепшыя вершы ўдзельнікаў літгуртка надрукаваны ў абласной газеце «Гомельская праўда» і цэнтральных дзіцячых газетах.

Сіламі ўдзельнікаў гуртка выдаецца рукапісны літаратурны часопіс «Першыя спробы». Ужо выпушчаны тры нумары часопіса. Удзельнікі літаратурнага гуртка выступалі перад калгаснікамі сельскагаспадарчай арцелі імя Дзяржынскага з чытаннем твораў, прысвечаных барацьбе за мір.

Папраўка

У рэцэнзіі на оперу «Фауст», надрукаванай у нашай газеце ад 21 кастрычніка г. г., у пятым абзацы першай калонкі пасля слоў «Музычныя вобразы доктара Фаўста і Маргарыты, пададзеныя ў прыўзнята-рамантычным гучанні, захапляюць сваёй меладычнай выразнасцю» трэба чытаць: «Вобраз Мефістофеля, перапоўнены сарказмам...» і далей як у тэксце.

Неапублікаваныя творы Якуба Коласа

Звычайна, калі гавораць аб пачатку літаратурнай дзейнасці Якуба Коласа, то спасылаюцца на яго верш «Не пытайце, не прасеце...», напісаны ў 1904 годзе. Аднак у апошні час, як паведамлялася аб гэтым у друку, выяўлены невядомыя дагэтуль вершы, якія гавораць аб тым, што пісьменнік распачаў сваю паэтычную дзейнасць значна раней.

Знойдзеныя трыццаць сем вершаў Коласа напісаны на рускай мове і датаваны 1898, 1902, 1904 і 1905 гадамі. Яны ўяўляюць сабою паэтычныя пошукі маладога паэта. Характэрна, што гэтыя пошукі ішлі ад рускай класічнай паэзіі XIX стагоддзя.

Сярод вершаў Я. Коласа на рускай мове ёсць шмат такіх, у якіх адчуваецца арыгінальны паэтычны талент пісьменніка, напрыклад: «Белоруссия», «В вагоне», «Невзгоды», «Вера», «Родная сторонка», «Тучка», «Скука-то какая...» і інш. Даволі цікавым творам у сэнсе станаўлення арыгінальнага голасу паэта і разумення ім неабходнасці рэальна адлюстроўваць жыццё народа ў канкрэтным соцыяльна-гістарычным плане з'яўляецца верш «Белоруссия». Верш гэты быў напісаны Коласам у 1902 годзе, адразу-ж пасля заканчэння ім настаўніцкай семінарыі.

Дваццацігадовы юнак, насуперак усім казённым сцверджанням аб шчаслівым жыцці народа пад уладаю «бацюшкі-цара», заявіў поўным голасам аб тым, што Беларусь з'яўляецца поўкаланіяльнай краінай, адсталай украінай царскай Расіі, дзе на ўсім відаць аднака беднасці і цемры. Беларускія працоўныя масы, гаворыць паэт у гэтым вершы, галоўным чынам сялянства, жорстка эксплаатуюцца панамі.

Колас, у процілегласць суб'ектыўнай сацыялогіі народнікаў, іх паэтызацыі патрыярхальнага сялянскага ўкладу, у сваёй творчасці не ідэалізаваў сялянскі быт, не паказваў вясковага «мужычка размалёванага у чырвоныя колеры і смачным, як вяземскі пернік» (М. Горкі). Адлюстроўваючы элементы новага ў жыцці сялянства, прабуджэнне яго да актыўнай палітычнай дзейнасці, Колас разам з тым не замоўчваў і адмоўных бакоў сялянскага быту.

«Мы патрабуем не ідэала жыцця, але самога жыцця, як яно ёсць, — гаварыў Бялінскі.—Ці дрэнна, ці добра, але мы не хочам яго ўпрыгожваць, бо думаем, што ў паэтычным уяўленні яно аднолькава цудоўна ў тым і іншым выпадку і таму іменна, што ісціннае, і што дзе ісціна, там і паэзія».

Вось гэта імкненне да ўсебаковага паказу жыцця народа, чаго патрабавалі ад пісьменнікаў вялікія рускія крытыкі, мы бачым ужо ў самых ранніх творах Якуба Коласа.

Верш «Белоруссия» вельмі падобны да верша Коласа на беларускай мове «Наш родны край», апублікаванне якога ў першым нумары «Нашай долі» (1906 г.) прынята лічыць пачаткам літаратурнай дзейнасці народнага паэта. І тут і там гучыць матыў беднасці, прыніжанасці і бесчалавечнай эксплаатацыі працоўных мас беларускага народа, матыў смутку і тугі працоўнага беларускага селяніна. Верш «Белоруссия»—гэта такая-ж песня-жальба, што і верш «Наш родны край» і шмат яму падобных са зборніка «Песні жальбы» (1910 г.).

Сярод другіх ранніх вершаў Коласа на сацыяльную тэматыку звяртае на сябе ўвагу верш пад загалоўкам «Невзгоды», які мае шмат агульнага з вядомым вершам паэта на беларускай мове «Людскія слёзы» (1907 г.). Аналагічныя матывы і ў вершы «Тучка», у якім паэт піша, што ён хоча стаць падобным да нябеснай хмаркі, каб плаваць

По далёким странам
Над убогим краем,
Над бесплодным полем,
Над зелёным гаем.

З боллю ў сэрцы гаворыць тут Колас аб стогнах і пакутах працоўных мас, якія нясуць на сваіх плячах ярмо эксплаатацыі і нацыянальнага ўціску:

Только бы не видеть
Горя и печали;
Пусть бы мои уши
Воплей не слыхали,
Песен заунывных,
Стонов и проклятий;
Не встречать бы лживых
Дружеских объятий.

Але нельга закрываць вочы на існуючую рэчаіснасць, і абавязак пісьменніка—адлюстроўваць яе ў сваіх творах, што і было зроблена Коласам у такіх ранніх вершах, як «Белоруссия», «Невзгоды», «Вера» і інш., а таксама ў пазнейшай яго творчасці:

Горе ты людское!
Где тебя не сыщешь?
В городах и в сёлах,
Всюду, горе, рыщешь.
. . . . . .
Слёзы вы людские!
Где вы не льётесь?
И отколь, скажите,
Горести, берётесь?
С самой колыбели
До сырой могилы
Тот же вопль, невзгоды,
Тот же вид унылый.
(«Невзгоды»).

Шмат вершаў Коласа на рускай мове ўяўляюць сабой глыбока лірычныя прыродаапісальныя творы («Осень», «Весна», «Пред грозою», «Заход солнца», «Ночь», «Пред рассветом», «В дождь», «Нива» і інш.), у якіх чытач угадвае будучага майстра беларускага пейзажа. Ужо ў гэтых вершах мы заўважаем умельства паэта ярка і маляўніча паказваць беларускую прыроду. Вось прыклад апісання прыроды ў пераднавальнічны час:

Тихо в воздухе. Не дрогнет
Ни былинка, ни листок.
В тихой роще приумолкнул
Птичек звонкий голосок.
Вся природа онемела
В ожидании грозы.
Лес и поле задремали,
Смолкнул голос стрекозы.
(«Пред грозою»).

Некаторыя з вершаў Коласа як па свайму ідэйна-тэматычнаму зместу, так і па сваёй будове нагадваюць вядомыя творы рускіх пісьменнікаў — А. В. Кальцова, Н. А. Някрасава, І. С. Нікіціна. Так, коласаўскі верш «Утешение» мае шмат агульнага з кальцоўскім вершам «К другу». І ў рускага і ў беларускага паэтаў гучаць аптымістычныя матывы, вера ў лепшую будучыню. Верш «Не грозная буря над лесом бушует...» па сваёй мастацкай будове падобны да адпаведных радкоў з някрасаўскай паэмы «Мороз—красный нос».

Кароткае знаёмства з раннімі вершамі Коласа на рускай мове, якія стаяць ля вытокаў яго творчасці, дае нам права гаварыць аб тым, што Колас пачынаў пісаць свае творы пад уплывам рускай класічнай літаратуры. Ужо ў такіх вершах, як «Белоруссия», «Невзгоды», «Тучка», «Вера», гучаць некрасаўскія і нікіцінскія матывы смутку і тугі. Гэты смутак і туга навеяны цяжкім жыццём народа, і Я. Колас, як Някрасаў і Нікіцін, не мог прайсці міма змрочных з'яў рэчаіснасці. Такім чынам, паэт з першых крокаў літаратурнай дзейнасці выступіў як рэаліст, як грамадзянін-патрыёт.

Апрача неапублікаваных ранніх вершаў на рускай мове, нам вядомы чатыры вершы-байкі Коласа на беларускай мове («Пан і Рэчка», «Пастух і Авечкі», «Мужык і Клёпкі», «Дуб і Кветкі»), таксама яшчэ нідзе не апублікаваныя. Гэтыя байкі былі ўключаны аўтарам у рукапіс «Другога чытання для дзяцей-беларусаў», але не дазволены да друку, безумоўна, па палітычных матывах, бо ў іх крытыкаваўся сацыяльна-палітычны лад царскай Расіі з яго «знакамітымі» свабодамі.

Так, байка «Пан і Рэчка» высмейвае «паноў», якія імкнуцца затрымаць пераможны рух працоўных да свабоды і прагрэсу. У байцы Колас гаворыць пра Пана, што ўздумаў затрымаць рэчку. Наваліўшы ў рэчку дроў, пайшоў Пан спаць у збудаваную ім хатку. Але нядоўга прышлося яму там адпачываць, таму што грозная навальніца ўшчэнт знішчыла хатку разам з Панам.

Другая байка—«Пастух і Авечкі» крытыкуе царскія «свабоды» ў былой Расійскай імперыі. Аўтар гаворыць аб тым, як статак Авечак доўгі час утрымліваўся Пастухом у загародцы, дзе рос толькі адзін мох ды сівец, хаця навакол рассціляліся пышныя сакавітыя травы:

Авечкі ў дзіркі пазіралі
І слінкі, бедныя, глыталі.
Жыць далей так не стала сілы —
Трыбух сцягнула ім і жылы.

І вось дзесяць бараноў пайшлі да Пастуха скардзіцца на свой лёс, на тое, што іх трымаюць у загародцы, б'юць палкамі і цкуюць сабакамі. Але, прышоўшы ў хату да Пастуха, бараны ўбачылі, што сам Пастух не лепшы за падпаскаў, што ён уласнымі рукамі стрыжэ з авечак воўну і здзірае скуру:

Сам Пастух сядзеў у хаце,
Стрыг Авечак, скуру дзёр,
Ды гуляў каля азёр
І качаўся ў сенажаці.

Байка заканчваецца тым, што Пастух, пад алегарычным вобразам якога патрэбна разумець цара, загадвае падпаскам зноў загнаць у загародку Авечак.

Названая байка-алегорыя была напісана не без уплыву рэволюцыі 1905 — 1907 г. г. (усе чатыры байкі напісаны ў пачатку 1907 года). У ёй Якуб Колас высмейвае тыя «свабоды», якія былі дадзены народам царскай Расіі згодна «Маніфеста 17 кастрычніка», і выкрывае эксплаататарскую сутнасць існуючага ладу.

Вершаваныя байкі Коласа стаяць ля вытокаў яго празаічных баек-алегорый пад агульнай назвай «Казкі жыцця».

Такім чынам, раннія неапублікаваныя творы Якуба Коласа ўяўляюць сабой вялікую цікавасць для вывучэння творчасці класіка беларускай літаратуры. Яны сведчаць аб тым, што пісьменнік з першых крокаў сваёй літаратурнай дзейнасці ўспрыймаў лепшыя традыцыі вялікай рускай літаратуры XIX стагоддзя і вучыўся паэтычнаму майстэрству ў найбольш таленавітых паэтаў.

А. СЕМЯНОВІЧ.

Галоўны рэдактар М. ГОРЦАЎ.
Рэдкалегія: М. БЛІСЦІНАЎ, В. ВІТКА — нам. галоўнага рэдактара, М. КАЦАР, П. ПАДКАВЫРАЎ, П. ПАНЧАНКА, М. ПАСЛЯДОВІЧ, Я. РАМАНОВІЧ, К. САННІКАЎ.

АТ 00109. Друкарня «Чырвоны Друкар», г. Мінск. Рэволюцыйная, 12. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара 2-31-94 сакратарыята 2-32-04, аддзелаў літаратуры і мастацтва 2-14-94.